

БУДОЎЛЯ ПА ДАВЕРЫ

3

КАМУНІКАТЫЎНЫЯ ПРАБЛЕМЫ Ў ПАДЛЕТКАЎ

7

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

19 ЛЮТАГА 2020 г. СЕРАДА

№ 33 (29147)

ЗВЯЗДА

ПЕРСПЕКТЫЎНАЯ АФРЫКА

Прэзідэнт Беларусі 19—20 лютага наведвае Егіпет з афіцыйным візітам.

У Каіры Аляксандр Лукашэнка правядзе перагаворы з Прэзідэнтам Егіпта Абдэль Фатахам аль-Сісі. Кіраўнікі дзяржаў абмяркуюць рэалізацыю бягучых дамоўленасцяў, дасягнутых падчас візіту егіпецкага лідара ў Мінск летам мінулага года, перспектывы развіцця гандлёва-эканамічных і гуманітарных адносін. Прэзідэнты разгледзяць пытанні ўзаемадзеяння на міжнародных пляцоўках, забеспячэння бяспекі ў рэгіёне і свеце ў цэлым. Па выніках перагавораў чакаецца падпісанне пакета двухбаковых дакументаў, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

У Аляксандра Лукашэнкі таксама запланаваны шэраг сустрэч і наведванне сумесна з Абдэль Фатахам аль-Сісі Новай адміністрацыйнай сталіцы Егіпта, якая будуецца ў 45 кіламетрах на ўсход ад Каіра.

Паралельна візіту кіраўніка дзяржавы ў Каіры пройдзе пасяджэнне Беларуска-Егіпецкага савета дзелавога супрацоўніцтва.

Гэта трэці афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі ў Егіпет. Першыя два адбыліся ў 1998 і 2017 гадах. Летась Прэзідэнт Егіпта ўпершыню наведаў з афіцыйным візітам Беларусь. Па выніках перагавораў у Мінску краіны дамовіліся выводзіць гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва на больш высокі, якасны і выніковы ўзровень.

«Паміж нашымі дзяржавамі няма абсалютна ніякіх праблемных пытанняў. Няма закрытых тэм для абмеркавання. Важна, што мы актыўна перайшлі да трансфармацыі дружалюбных палітычных адносін у шматпланавае і выгаднае эканамічнае супрацоўніцтва. І сёння ўжо ёсць адчувальны вынік і сур'ёзны прагрэс у гэтым накірунку», — сказаў тады Аляксандр Лукашэнка.

Беларусь і Егіпет падпісалі комплексную праграму (дарожную карту) развіцця супрацоўніцтва на 2019—2020 гады. Бакі дамовіліся пашыраць супрацоўніцтва ў такіх перспектыўных сферах, як інфармацыйна-камунікацыйныя напрамкі развіцця, аэракасмічныя і авіяцыйныя тэхналогіі, нанаматэрыялы, малекулярная генетыка, металазнаўства, фармацэўтыка, оптыка. Плануецца таксама актывізаваць узаемадзеянне ў сферы адукацыі.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ХАЦЕЛАСЯ Б ПОЎНАЙ ЯСНАСЦІ»

Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з кіраўніком «Раснафты»

З Ігарам Сечыным, галоўным выканаўчым дырэктарам расійскай кампаніі, кіраўнік краіны абмеркаваў нафтавыя пытанні.

«Хаваць няма чаго. Хацеў бы абмеркаваць з кіраўніком найбуйнейшай нафтаздабываючай кампаніі, публічнай кампаніі, сітуацыю, якая складваецца ў нашых узаемаадносінах, можна сказаць, Беларусі і Расіі, па нафце», — сказаў Прэзідэнт.

Ён дадаў, што з Ігарам Сечыным хоча параіцца, як дзейнічаць далей і працаваць у тым ліку і з «Раснафтай». У мінулым годзе кампанія паставіла ў Беларусь палову «чорнага золата», якое наша дзяржава купляла ў Расіі і перапрацоўвала на айчынных НПЗ.

«Хацелася б поўнай яснасці. Карыстаючыся тым, што мы даўно ведаем адзін аднаго, вы і падкажаце нешта, і мы зможам дамовіцца аб далейшым нашым супрацоўніцтве», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ігар Сечын падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за запрашэнне і магчымасць абмеркаваць з ім актуальную тэму.

«Я вельмі цаню тыя даверлівыя адносіны, якія існуюць паміж намі. І хацеў бы сказаць, што «Раснафта» з'яўляецца адным з буйных інвестараў у эканоміку Беларусі, і мы з'яўляемся ўдзельнікамі акцыянернага капіталу Мазырскага НПЗ, — канстатаваў Ігар Сечын. — І адказваючы на ваша пытанне, што рабіць далей, Аляксандр Рыгоравіч, — трэба працаваць разам. Канешне ж, мы настроены канструктыўна».

Марыя ДАДАЛКА.

❍ Даведка

«Раснафта» — найбуйнейшая нафтагазавая карпарацыя свету. Па інфармацыі, размешчанай на афіцыйным сайце кампаніі, у 2019 годзе ўзровень здабычы вуглевадародаў склаў больш за 285 мільёнаў тон нафтавага эквіваленту, пры сяроднесутачным узроўні здабычы каля 5,8 мільёна бараляў. Гэты вынік адзін з найлепшых у глабальнай галіне. Аб'ём перапрацоўкі нафты і газавага кандэнсату за мінулы год — 110 мільёнаў тон. З іх 10 мільёнаў — на нафтаперапрацоўчых заводах кампаніі за мяжой. Кампанія валодае сеткай запраўак на тэрыторыі Беларусі, якая складаецца з 36 АЗС.

СВІСЛАЦКІЯ «ЛЕДАКОЛЫ»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Лёд на Свіслачы хоць месцамі вельмі тонкі, але ёсць. Зрэшты, байдарачнаму «каравану», які прабіраецца праз замерзлую плынь на рацэ паміж сталічнымі Траецкім прадмесцем і праспектам Пераможцаў, ён зусім не перашкода.

ЦЫТАТА ДНЯ

Леанід КАСІНСКІ, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны:

«Указам кіраўніка дзяржавы аб прызыве на тэрміновую ваенную службу і аб звальненні з тэрміновай ваеннай службы ў запас замацаваны досыць значныя прэферэнцыі. У першую чаргу, гэта ўлік працягласці тэрміновай службы ў страхавы працоўны стаж. Другая мера — гэта замацаванне права за вайскоўцамі, якія выконваюць свой воінскі абавязак (і за членамі іх сем'яў), на тыя інтэрнаты, якімі яны былі забяспечаныя ў адпаведнасці з працоўнымі дагаворамі перад прызывам на тэрміновую службу. Таксама ўказам замацавана права ваеннаслужачых па заканчэнні службы на бясплатнае навучанне на факультэтах даўніверсітэцкай адукацыі і падрыхтоўкі пры паступленні і падрыхтоўцы да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, прычым не толькі ваенныя, але і агульнаграмадзянскія».

Размова па сутнасці

МОВА АНЛАЙН

Ці дапамагаюць нам новыя інфармацыйныя тэхналогіі гаварыць і пісаць па-беларуску?

Паводле чаго вызначаецца жыццядзейнасць і жыццяздольнасць той ці іншай мовы? Яшчэ гадоў пятнаццаць таму асноўнымі крытэрыямі лічылася колькасць вучняў, якія атрымліваюць на ёй адукацыю або вывучаюць яе, наяўнасць кнігавыдання, прысутнасць мовы ў дзяржаўных інстытуцыях... Сёння ўсё гэта таксама, безумоўна важна, але новыя тэхналогіі і тут дыктуюць свае правілы: пра тое, наколькі мова жывая, мяркуюць у першую чаргу па яе прысутнасці ў віртуальнай прасторы — у камп'ютарным забеспячэнні, у рознага кшталту дадатках, у сацыяльных сетках, увогуле ў Сеціве... Хтосьці тут жа, прыгадаўшы беларускую раскладку клавіятуры, у тым ліку і для мабільных прылад, беларускамоўную «Вікіпедыю», «Вайбер» ды «Фэйсбук», якія будуць камунікаваць з карыстальнікам па-беларуску, было б толькі яго жаданне, скажа, што ў гэтым плане з нашай мовай усё ў парадку. Але ці так гэта насамрэч? У грамадстве, дзе большасць носьбітаў менавіта жывой мовы дажываюць век у вёсках ці пасяліліся на кніжных старонках у творах класікаў, а моладзь толькі пачынае мовай цікавіцца, ці не прыйдзем мы ўрэшце да мовы перакладчыка Google — і яна будзе лічыцца эталонам?

Пра гэта і пра іншыя рызыкі і праблемы, а таксама пра станоўчыя моманты ва ўплыве інфармацыйных тэхналогій на развіццё беларускай мовы вялася гутарка падчас круглага стала ў рэдакцыі «Звязды».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

СТАР. 6

Беларусь памятае

ЭСТАФЕТА ІДЗЕ ДАЛЕЙ...

Учора каля Кургана «Дружбы» на стыку межаў Беларусі (Верхнядзвінскі раён), Латвіі і Расіі адбылася ўрачыстая цырымонія перадачы «Эстафеты Перамогі» ўздоўж знешніх межаў дзяржаў-удзельніц СНД. Акцыя прысвечана 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Фота БелТА.

Эстафета перададзена беларускімі пагранічнікамі іх калегам з Расійскай Федэрацыі.

Падчас заключнага этапу патрыятычнага марафону на беларускай зямлі ў памежжы былі арганізаваныя ўрачыстыя сходы, мітынгі і ўрокі мужнасці.

Ва ўрачыстым мерапрыемстве, прымеркаваным да перадачы эстафеты, узялі ўдзел кіраўніцтва Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі, прадстаўнікі Каардынацыйнай службы Савета камандуючых пагранічнымі войскамі краін СНД і прадстаўнікі пагранічнай службы ФСБ Расіі, кіраўніцтва мясцовай улады, члены ветэранскіх і маладзёжных арганізацый, прадстаўнікі духавенства.

Каля чатырох тысяч кіламетраў у Беларусі — такі доўгі шлях у эстафеты, якая пабывала на кожнай пагранічнай заставе. Літаральна ўся мяжа стала месцам правядзення гэтай акцыі. Адбылося шмат розных сустрэч ветэранаў пагранічнай службы з пагранічнікамі, кадэтамі, вясковымі жыхарамі. Моладзь праявіла вялікую цікавасць да мерапрыемстваў. Хлопцы і дзяўчаты ўважліва слухалі расказы пра подзвігі пагранічнікаў падчас вайны, пра будні службы ў наш час.

СТАР. 2

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Албанія атрымае больш за €1 млрд для аднаўлення пасля землятрусу

Удзельнікі міжнароднай донарскай канферэнцыі ў Бруселі сабралі больш за €1 млрд дапамогі Албаніі для пераадолення наступстваў землятрусу, які адбыўся ў краіне ў лістападзе мінулага года. Пра гэта паведаміла кіраўнік Еўракамісіі (ЕК) Урсула фон дэр Ляен. «Добрыя навіны для народа Албаніі — мы перавысілі наш мэтавы паказчык для аднаўлення Албаніі і дасягнулі €1,15 млрд, у тым ліку ўнёсак Еўрасаюза склаў €400 млн», — сказала яна.

У міжнароднай донарскай канферэнцыі для Албаніі ўзялі ўдзел краіны — члены ЕС, дзяржавы Заходніх Балкан, а таксама міжнародныя арганізацыі, у тым ліку ААН і Сусветны банк.

У Парагваі абвясцілі надзвычайны рэжым з-за ліхаманкі дэнге

Ніжняя палата парламента Парагвая зацвердзіла законапраект аб увядзенні рэжыму надзвычайнай сітуацыі з-за распаўсюджання ліхаманкі дэнге на тэрыторыі краіны. Пра гэта гаворыцца ў апублікаваным паведамленні Палаты дэпутатаў. «Тэрмін дзеяння — 90 дзён», — адзначаецца ў дакументе. Мера дазволіць накіроўваць з бюджэту краіны больш сродкаў на барацьбу з захворваннем. Раней аналагічнае рашэнне прыняла Палата сенатараў (верхняя палата парламента). У канцы студзеня ўлады сталіцы краіны Асунсьон абвясцілі ў горадзе рэжым надзвычайнай сітуацыі для барацьбы з распаўсюджаннем ліхаманкі дэнге. Мера прадугледжвае, у прыватнасці, фумігацыю памяшканняў. Як вядома, дэнге — вірусная інфекцыя, якая пераважае ў трапічных і субтрапічных рэгіёнах.

У Сікстынскую капэлу вярнулі габелены Рафаэля



Упершыню за 500 гадоў у Сікстынскай капэле ў Ватыкане вывесілі разам усе 12 габеленаў, выкананых па эскізах Рафаэля Санці, перадае Reuters. Упершыню яны былі вывешаны да дня Святога Стэфана 26 снежня 1519-га. Праз некалькі месяцаў Рафаэль памёр, так і не пабачыўшы серыю твораў скончанай, адзначае ТАСС. Габелены, кожны з якіх важыць 50-60 кілаграмаў, выкананы з залатых і шаўковых нітак і адлюстроўваюць біблейскія эпізоды з жыцця апосталаў Пятра і Паўла. Выстаўка прымеркавана да 500-годдзя з дня смерці мастака і будзе доўжыцца ўсяго тыдзень. Пазней габелены вернуцца ў музеі.

КАРАТКА

• Сёлета ў Беларусі плануецца пабудаваць 135 тысяч кв. м жылля, якое будзе ацяпляцца электрычнасцю.

• «Белпошта» прапануе бясплатна адправіць паштоўку да 23 лютага.

• «Луч» выпусціў гадзіннікі з вершам Максіма Багдановіча.

• Банк развіцця Беларусі ў 2020-м можа выпусціць еўрабонды ў нацвалюце на Br200 млн.

• Караеў: нарказлачынстваў стала менш, але колькасць канфіскаваных рэчываў выросла.

• Палявыя жаваранкі і кулікі прыляцелі ў Беларусь.



• Тыдзень роднай мовы пройдзе ў БДУ з 21 па 27 лютага.

• «Белпошта» прыпыніла прыём паштовых адпраўленняў з Кітая.

Сацыяльны бізнес

Праект, які натхняе

Прадпрымальнікі запусцілі сацыяльную ініцыятыву, каб сэканоміць сродкі бюджэту, але вымушаны за гэта плаціць

Ці ведалі вы, колькі сродкаў бюджэту (лічыце, нашых сродкаў) траціцца, каб ачысціць пад'езды, слупы ды прыпынкі на вуліцах ад празмернай і не заўсёды карыснай рэкламы? Прадпрымальнікі з Беразіно Дзмітрый і Святлана ЛАБКОВІЧЫ знайшлі спосаб зрабіць гэтую рэкламу цывілізаванай і стварылі сацыяльны праект, каб сэканоміць нашы сродкі. Але ўсё аказалася не так проста...

З ЛІФТА — НА ВУЛІЦУ

Пяць гадоў таму Лабковічы, мабыць, як і любая маладая сям'я, пачалі шукаць дадатковую крыніцу даходу. Святлана пакінула сваю работу ў школе, а ўвагу Дзмітрыя, які на той момант яшчэ працаваў у МНС, прыцягнула рэклама ў ліфтах.

— Рэклама для мяне ў першую чаргу была творчасцю і заўсёды цікавіла як сфера дзейнасці, таму я адразу звярнуў увагу на камерцыйныя аб'явы ў ліфтах дамоў Мінска. Аднак у Беразіно пераважае малапавярховая забудова, і мы пачалі думаць, як можна зрабіць рэкламу цывілізаванай менавіта ў маленькіх гарадах, — кажа Дзмітрый Лабковіч. — Амаль адразу мы зразумелі, што можна не толькі зарабляць на гэтым грошы, але і рабіць нешта добрае для людзей, каб рэклама перастала іх раздражняць і стала якасным прадуктам. І вельмі хутка наш камерцыйны праект ператварыўся ў сацыяльна-рэкламны.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

Парламенцкі дзённік

ДРУГІ РАЗ — ЯШЧЭ ГОРШ

Заканадаўцы плануюць зрабіць больш жорсткімі ўмовы знаходжання ў лячэбна-працоўных прафілакторыях для тых, хто не зрабіў вывады з першага разу

Да асоб, накіраваных у ЛПП не першы раз і раней судзімых, прапануецца прымяняць больш строгія правілы ўтрымання. У прыватнасці, паменшыць норму жылой плошчы з двух з паловай да двух квадратных метраў, а магчымасць атрымання пасылак ці перадач — да трох разоў, бандэроляў ці дробных пакетаў — да двух на працягу года.

Працягласць асабістага часу прапануецца скараціць да гадзіны (у адрозненне ад «навічкоў», якія маюць тры гадзіны). Таксама ў выпадку прыняцця змяненняў на асабовы рахунак будзе залічвацца не 25, а 15 % заработнай платы.

Гэтыя і іншыя прапановы разглядаліся на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Як паведаміў журналістам **старшыня камісіі Алег БЕЛАКОНЕЎ,** праект Закона «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб парадку ва ўмовах накіравання грамадзян у лячэбна-працоўныя прафілакторыі і ўмовах знаходжання ў іх» унесены ў ніжнюю палату парламента 29 лістапада мінулага года. Галоўны распрацоўшчык законапраекта — Міністэрства ўнутраных спраў.

«Папярэдні закон існуе ўжо дзесяць гадоў. Былі выдадзены ключавыя ўказы, дэкрэты Прэзідэнта, у тым ліку № 3, якія патрабуюць прывядзення сістэмы прафілактыкі правапарушэнняў і накіравання грамадзян, а таксама ўмоў іх знаходжання ў лячэбна-працоўных прафілакторыях да адной роўнасці», — растлумачыў Алег Белаконеў.

Ён паведаміў, што ў праекце прадугледжана азначэнне новай катэгорыі людзей, якія могуць накіроўвацца і знаходзіцца ў ЛПП: працаздольныя грамадзяне, якія не працуюць і вядуць асацыяльны лад жыцця. У камісій па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва з'явіцца права прымаць адпаведнае рашэнне. Для такой меры чалавек мусіць быць прызнаны хранічным алкаголікам, наркаманам ці таксікаманам і здзейсніць два адміністрацыйныя правапарушэнні ў стане ап'янення, падкрэсліў дэпутат.

Сярод іншага на пасяджэнні камісіі прапанавана выключыць неабходнасць праходжання паўторнай медыцынскай камісіі на працягу года, што дазволіць удвая скараціць колькасць аглядаў (штогод у ЛПП змяшчаецца каля шасці тысяч грамадзян).

Законапраект будзе разгледжаны на другой сесіі Палаты прадстаўнікоў у першым чытанні.

Варвара МАРОЗАВА.

Парадак на зямлі

ЭКАЛОГІЯ — ЧАЛАВЕК — ЭКАНОМІКА

Як утрымаць баланс у гэтай трыядзе, абмеркавалі ўдзельнікі пасяджэння выніковай калегіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

Работа, праведзеная падраздзяленнямі Мінпрыроды, дазволіла ў цэлым выканаць асноўныя паказчыкі, даведзеныя ўрадам на 2019 год. Забяспечаны прырост запасаў нафты ў аб'ёме 0,978 млн тон, ці 163 % да планавага паказчыка. Сумарны аб'ём выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферу знізіўся да 1,23 млн тон (пры плане ў 1,231 млн тон). Плошча асабліва ахоўных прыродных тэрыторый выраслa да 9 % ад агульнай плошчы краіны.

Але, нягледзячы на пэўныя поспехі, застаюцца пытанні, якія патрабуюць аператыўнага вырашэння.

Сцёкі праблем

— За апошнія пяць гадоў на 8 % вырас аб'ём скіду сцёкавых вод у навакольнае асяроддзе, 52 ачышчальныя збудаванні ў краіне працуюць неэфектыўна, — адзначыў **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК.** — Ёсць пэўныя пытанні да выканаўчай улады на месцах і нашых тэрытарыяльных органаў, і іх трэба абвастрыць да канца — рашэнне гэтай праблемы адкладваць больш немагчыма.

Намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХМЕЛЬ звярнуў увагу і на сітуацыі са скідам недастаткова ачышчаных сцёкавых вод у водныя аб'екты. У большасці выпадкаў гэта звязана з неэфектыўнай работай камунальных ачышчальных збудаванняў. Па-ранейшаму асноўны іх аб'ём (82 % ад агульнай колькасці) прыходзіцца на Мінскую вобласць. Сёлета трэба забяспечыць зніжэнне шкодных выкідаў, а таксама паэтапна выводзіць з эксплуатацыі палі фільтрацыі, якія аказваюць найбольш негатыўнае ўздзеянне на стан водных рэсурсаў.

Ці дакладны прагноз?

— У 2019 годзе былі ўведзены ў эксплуатацыю 15 аўтаматычных метэастанцый, і сёння агульная колькасць пунктаў прыземных метэаназіранняў Белгідрамета складае 61 з узроўнем аўтаматызацыі 97 %, — расказаў **першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі ПІРШТУК.** — Сёлета да іх дабавяцца яшчэ некалькі метэастанцый, а колькасць доплеравскіх метэарадыёлакатараў дасягне пяці.

Праведзеныя мерапрыемствы дазволілі павысіць апраўдвальнасць прагнозаў надвор'я: па абласцях на трое сутак — да 96,7 %, на адны суткі — да 98 %. Апраўдвальнасць штармавых папярэджванняў аб небяспечных з'явах склала 100 %.

Зялёны захопнік

Адна з актуальных праблем — распаўсюджанне баршчэўніка Сасноўскага. Як расказаў **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр КОРБУТ,** летась былі знішчаны папуляцыі расліны на 907,31 га, ці 24,7 % ад агульнай плошчы інвазіраваных земляў. Пры гэтым палявыя абследаванні выявілі 1117 новых месцаў яго росту, большасць з іх знаходзіцца ў Віцебскай вобласці. Так, па стане на лістапад 2019 года, плошча, якую займае баршчэўнік Сасноўскага, склала 4615,73 га, з іх 3947,39 га — на Віцебшчыне.

Міністр даручыў інспектарам больш працаваць з прыродакарыстальнікамі — лясгасамі, аб'ектамі Мінэнерга і іншымі, на землях якіх фіксуюцца інвазіі.

Адходы — у работу

У мінулым годзе ўзровень вымання другасных матэрыяльных рэсурсаў са складу камунальных адходаў склаў 22,6 %. Але, па словах Андрэя Худыка, гледзячы на еўрапейскі вопыт, гэта ўсё роўна мала. Тым больш што ёсць раёны, дзе гэты паказчык не дасягае і 15 %: напрыклад, у Карэліцкім раёне ён 13,3 %, у Воранаўскім — 13,5 %. А гэта значыць, што там працягваюць захоўваць ДМР. Усяго ж па краіне зафіксавана больш за 2,5 тысячы фактаў захавання ДМР на палігонах, адходаў у несанкцыянаваных месцах — каля 13,5 тысячы.

— Мы павінны імкнуцца да перадавога сусветнага вопыту ў гэтым пытанні, — адзначыў міністр. — Калі сапраўды пачнём выкарыстоўваць адходы, а не захоўваць іх, то і палігоны будаваць не прыйдзецца.

Ад традыцыйных рэсурсаў да энергіі Зямлі

Павышэнне выкарыстання ўласнай мінеральнай сыравіны — яшчэ адна важная задача. Па словах Андрэя Худыка, па некаторых пазіцыях павялічваецца імпарт карысных выкапняў, ужо разведаных на тэрыторыі Беларусі, — напрыклад, каменнай солі, пяску, бурага вугалю, гіпсу і іншых. Таму Мінпрыроды патрэбна больш актыўна працаваць з іншымі ведамствамі па пытаннях імпартазамяшчэння прыродных рэсурсаў.

Неабходна развіваць і максімальнае выкарыстанне аднаўляльных рэсурсаў, у тым ліку і геатэрмальнай энергіі. З дапамогай цяпла нетраў можна знізіць спажыванне іншых энергарэсурсаў для ацяплення і зменшыць выкіды парніковых газаў. За апошнія 14 гадоў у Швецыі ўстаноўлена больш за 1,7 млн цеплавых помпаў. Развіваюць гэты напрамак і суседнія Польшча і Украіна. У нас жа толькі некаторыя кампаніі выкарыстоўваць гэты рэсурс.

***

— Сёлета мы павінны яшчэ больш актыўна ўключыцца ў працу ў рамках кампаніі «Добраўпарадкуем малую радзіму». Неабходна падвоіць вынікі таго, што зрабілі раней. А дадатковым стымулам для навядзення парадку на месцах можа стаць укараненне рэйтынгу экалагічнага развіцця па рэгіёнах Беларусі, які б адлюстроўваў намаганні мясцовых улад у забеспячэнні спрыяльнага навакольнага асяроддзя і высокай якасці жыцця для насельніцтва», — рэзюмаваў міністр.

У сваю чаргу **намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір ДВОРНІК** адзначыў, што падчас кантрольнай дзейнасці органам Мінпрыроды трэба прымяняць санкцыі да тых асоб у суб'ектах гаспадарання, якія маюць фінансавыя ці арганізацыйныя механізмы выправіць парушэнне, змяніць сітуацыю ў лепшы бок. Такі падыход дапаможа больш эфектыўна наводзіць парадак на зямлі.

Вераніка КОЛАСАВА.

Ведай нашых

«Звязда» сярод пераможцаў

У калоннай зале Цэнтральнага Дома афіцэраў у аўторак сабралася некалькі дзясяткаў журналістаў з усёй краіны. Нагода для гэтага была святочная.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Міністэрства абароны Беларусі падвяло вынікі творчага конкурсу.

Прысвечаны ён лепшаму асвятленню ў сродках масавай інфармацыі пытанняў будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл, а таксама патрыятычнага выхавання насельніцтва. І ўжо па традыцыі праводзіцца напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл.

— Каля чатырох тысяч публікацый у друкаваных СМІ, больш за 200 гадзін тэле- і 40 гадзін радыёвяшчання штогод прысвячаецца вайсковай тэме, — зазначыў **міністр абароны Беларусі Віктар ХРЭНІН.** — Краеугольны камень — аб'ектыўнасць і творчы падыход. Дзякуючы гэтаму грамадскасць штодня знаёміцца з дзейнасцю арміі.

Лаўрэатам конкурсу ў намінацыі «Прафесіяналізм і журналісцкае майстэрства» стаў загадчык аддзела РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» Валяр'ян ШКЛЕННІК. Віншуем!

Ул. інф.

ЭСТАФЕТА ІДЗЕ ДАЛЕЙ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Намеснік старшыні Дзяржпагранкамітэта Беларусі генерал-маёр Ігар ПЕЧАНЬ нагадаў, што акцыя распачалася 5 лютага на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці. І на працягу двух тыдняў прайшла па тэрыторыі Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай і Віцебскай абласцей. Ён падкрэсліў, што трэба памятаць якой цаной дасталася нам Вялікая Перамога. І задача на сёння і заўтра — захаваць гістарычную памяць: нельга дапусціць, каб гісторыю перапісвалі. Агульнае мінулае яднае ў наш час людзей, якія жывуць у некалі адзінай краіне-пераможцы. Гэтая эстафета — як сімвал таго, што сучасныя пагранічнікі павінны не горш дзедаў і прадзедаў ахоўваць межы сваёй Радзімы. І ўсе ўмовы для гэтага створаны, а прафесіяналізм вайскоўцаў не выклікае сумненняў.

Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ адзначыў, што месца перадачы эстафеты прадстаўнікам памежнага ўпраўлення Федэральнай службы бяспекі Пскоўскай вобласці знакавае. Тут штогод праводзяцца мінародныя сустрэчы з удзелам ветэранаў і падпольшчыкаў, потым дзейнічае маладзёжны лагер, у якім удзельнічаюць хлопцы і дзяўчаты з трох краін. На сёння ў Прыдзвінскім краі пражываюць толькі каля 730 ветэранаў ВАВ, яны заслужылі штодзённага клопату. І такія мерапрыемствы, як эстафета Перамогі, нагадваюць пра подзвігі савецкіх людзей падчас Вялікай Айчыннай вайны.

А **намеснік старшыні абласнога Сходу дэпутатаў Пскоўскай вобласці Юрый САРОКІН** дадаў, што з пакалення ў пакаленне будзе перадавацца вялікая ўдзячнасць тым, хто перамог. «Дзякуй ім за права жыць, быць свабоднымі грамадзянамі незалежнай краіны. Слава і вечная памяць тым героям, што загінулі», — дадаў ён.

Сімвал Перамогі ўжо заўтра будзе дастаўлены ў Маскву. І яго будуць перадаваць па знешніх межах краін — членаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Пагранічнікі Расіі, як і Беларусі, з гонарам бяруць удзел у акцыі. Яна яднае, з'яўляецца патрыятычным з вялікай літары, добрым прыкладам таго, што памяць і павага да агульнага мінулага не мае меж.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

На слыху

Грып: пакуль фіксуюцца адзінкавыя выпадкі

У сацыяльных сетках распаўсюджваецца інфармацыя, што ў Мінску фіксуюцца выпадкі «свінога грыпу». У прыватнасці, некалькі пацыентаў знаходзяцца ў сталічнай інфекцыйнай бальніцы з дыягназам грып А H1N1. У Міністэрстве аховы здароўя пацвярджаюць, што адзінкавыя выпадкі гэтага грыпу сапраўды зафіксаваны, і тлумачаць, чаму ён цяпер не такі небяспечны, як некалькі гадоў таму.

Многія памятаюць вялікую ўспышку «свінога грыпу» ў 2009 годзе. Пачаўшыся ў Мексіцы і ЗША, ён вельмі хутка распаўсюдзіўся яшчэ ў 213 краінах свету. З-за гэтага была аб'яўлена пандэмія, а ад пнеўманіі і іншых ускладненняў, выкліканых H1N1, па розных даных, тады загінула ад 100 да 400 тысяч чалавек ва ўсім свеце.

Сітуацыю патлумачылі ў Міністэрстве аховы здароўя.

— У Мінску адсутнічае эпідэмічны пад'ём захворвання грыпам, і гэтаму садзейнічала старанная работа, якая праводзілася ў апошнія гады па вакцынацыі. У сталіцы рэгіструюць адзінкавыя выпадкі грыпу, часцей за ўсё гэта грып А H1N1. Новых сератыпаў віруса, да якіх у насельніцтва не было б імунітэту, не зафіксавана, — расказала **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН.**

— Мы ацэньваем «свіны грып» як звычайны вірус. Адзінкавыя яго выпадкі фіксуюцца на працягу некалькіх апошніх гадоў. У гэтым няма нічога страшнага. У насельніцтва сфарміраваўся імунітэт, і хвароба працякае ў лёгкай форме», — патлумачыў **намеснік галоўнага ўрача Мінскай гарадской клінічнай інфекцыйнай бальніцы Алег СКРЫПКО.**

Алена КРАВЕЦ.

Крымінал

Браканьеры спрабавалі з'ехаць І збілі дзяржінспектара

Здарэнне адбылося ў Дзяржынскім раёне, пацярпеў работнік Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету. Такую інфармацыю размясціла прэс-сакратар МУС Вольга Чамаданава ў сваім Telegram-канале.

Спецаперацыю арганізавалі супрацоўнікі галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй (ГУБАЗіК) МУС. Двое братоў 50 і 52 гадоў патрапілі ў поле зроку праваахоўнікаў даўно, аднак задакументаваць супрацьзаконную дзейнасць, якую яны ўмела маскіравалі, атрымалася толькі нядаўна.

Браты застрэлілі самку лася з двума эмбрыёнамі. Тушу разабралі на наступны дзень у лесе, парэшткі закапалі. Затрымліваць іх вырашылі пры перавозцы мяса, — распавялі ў ГУБАЗіК МУС.

Падчас рэйду мужчыны паспрабавалі схавацца на аўтамабілі «Ніва». Падчас пагоні кіроўца адмовіўся добраахвотна спыніцца і збіў інспектара, які спрабаваў перашкодзіць яму з'ехаць.

У рэшце рэшт падазраваныя кінулі транспарт і ўцяклі, аднак у той жа дзень былі затрыманы байцамі спецпадраздзялення «Алмаз» па месцы жыхарства. Там жа знайшлі шэсць адзінак агнястрэльнай зброі.

У аўтамабілі было каля 160 кілаграмаў ласінага мяса і прылады для разбору тушы. На наступны дзень праваахоўнікі выявілі і яму з парэшткамі жывёлы, уключаючы двух эмбрыёнаў.

Заведзена крымінальная справа за незаконнае паляванне з прычыненнем шкоды ў асабліва буйным памеры. Таксама праводзіцца праверка па факце гвалту ў дачыненні да службовай асобы, якая выконвае службовыя абавязкі. Вядома, што раней абодва фігуранты прыцягваліся да крымінальнай адказнасці, у тым ліку за незаконнае паляванне.

Як удакладнілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, інспектар атрымаў удар нагі, цяпер ён знаходзіцца на бальнічным.

У дзяўчыны выявілі больш за 40 закладак

Праваахоўнікі Савецкага РУУС сталіцы затрымалі з доказамі злачынства жыхарку Мінскага раёна, якая мела намер збыць вялікую колькасць закладак з псіхатропным рэчывам.

Паводле аператыўнай інфармацыі, 21-гадовая грамадзянка працавала на інтэрнэт-краму па продажы наркотыкаў. На працягу месяца яна ў сябе дома фасавала псіхатропы на драбнейшыя дозы, а пасля адпраўлялася ў сталіцу для збыту.

Адна з паездак завяршылася для яе затрыманнем. Каля ляснога масіву ў Цэнтральным раёне сталіцы праваахоўнікі ў дзяўчыны выявілі 40 закладак з парашкападобным рэчывам белага колеру. Канфіскаванае было накіравана на даследаванне, экспертыза паказала, што гэта асабліва небяспечны псіхатроп — альфа-PVP, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама.

Таксама пры правядзенні агляду жылля затрыманай супрацоўнікі наркакантролю выявілі яшчэ звыш 35 грамаў такога ж рэчыва, электронныя вагі, ізастужку і палімерныя пакеты.

Вядома, што ў кватэры дзяўчына жыла разам з маці, якая пра злачынную дзейнасць дачкі нават не здагадвалася.

Установлена, што затрыманая нідзе не працуе, раней да крымінальнай адказнасці не прыцягвалася. Праваахоўнікі ўстанаўліваюць іншых асоб, якія маюць дачыненне да незаконнага абароту наркотыкаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БЕЛАРУСБАНК

Публичная оферта (предложение) на изменение порядка уменьшения ставки дохода по вкладу в связи с изменением ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь до 8,75 % годовых.

1. ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает, что снижение ставки дохода, указанной в договоре банковского вклада (депозита), в связи со снижением с 19.02.2020 ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь до 8,75 % годовых (Постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 12.02.2020 № 42) осуществляется с 20.03.2020 по следующим банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях:
- срочный банковский вклад «Премиально-накопительный «Детский» (проценты по вкладам, открытым с 13.11.2015 по 31.03.2016 (включительно));
- срочный банковский вклад «Жилищно-накопительный» (проценты по вкладам, открытым по 28.10.2018 (включительно));
- банковский целевой вклад «Попечение» (проценты по вкладам, открытым по 31.01.2016 (включительно)).

Установленный порядок применяется к вышеуказанным банковским вкладам (депозитам) в случае, если по ним по состоянию на 20.03.2020 не начисляется пониженная процентная ставка или доход по вкладу не начисляется в размере ставки вклада до востребования.

2. Акцептом публичной оферты (предложения), указанной в пункте 1, является получение вкладчиком в полном объеме процентов по вкладу за период с 19.02.2020 до даты изменения процентов по вкладу – 20.03.2020.

Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте www.belarusbank.by и в отделениях «Беларусбанка»

Сохранность и возврат вкладов гарантируются в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь. Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 11.01.2019, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов)

белагропромбанк
www.belapb.by
ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

ОАО «Белагропромбанк»

ОАО «Белагропромбанк» сообщает, что в связи с уменьшением с 19.02.2020 ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь на 0,25 процентного пункта до 8,75 процента годовых, **с 21.03.2020** ОАО «Белагропромбанк» уменьшает на 0,25 процентного пункта плавающие процентные ставки по договорам банковского вклада «Универсальный» и «Сберегательный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006. Также, в соответствии с условиями договора, пролонгация вклада «Стабильный» осуществляется на условиях применения процентной ставки для данного вида вклада (депозита), действующей на день продления договора.

Лицензия на осуществление банковской деятельности
№ 2 от 13 февраля 2019 года
выдана Национальным банком Республики Беларусь.
УНП 100693551

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
строительства объекта
«Жилая многоквартирная застройка в границах ул. Л. Беды – ул. 1-я Поселковая – ул. Восточная – ул. 1-я Базисная в г. Минске» 1-я очередь. Жилой дом № 1 по генплану

Сведения о застройщике:
Общество с ограниченной ответственностью «ТЕНКинвест» (ООО «ТЕНКинвест»).
Местонахождение: (юридический адрес) 223040, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Боровлянский с/с, а. г. Лесной, 19В-14, тел. +375 17 236-30-10; **(отдел продаж)** г. Минск, ул. Леонида Беды, 45-«4 Сезона», тел.: +375 29 782-07-07; +375 44 782-07-07.
Режим работы: рабочие дни – с понедельника по пятницу; рабочие часы – понедельник – пятница с 9.00 по 17.30; обед – с 13.00 по 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.
Данные о государственной регистрации: зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191116618.
В течение трех предшествующих лет ООО «ТЕНКинвест» как заказчиком строительства были построены следующие объекты:
жилой дом, расположенный по адресу: Минский р-н, д. Боровляны, ул. Интернациональная, 35 (срок строительства – 14 месяцев);
жилой дом, расположенный по адресу: Минский р-н, д. Боровляны, ул. Интернациональная, 35/1 (срок строительства – 10 месяцев);
жилой дом, расположенный по адресу: Минский р-н, д. Боровляны, ул. Интернациональная, 35/2 (срок строительства – 13 месяцев).
Информация об объекте строительства:
Цель строительства – возведение 16-этажного, односекционного, 110-квартирного жилого дома крупнопанельного домостроения (№ 1 по генплану) Объекта: «Жилая многоквартирная застройка в границах ул. Л. Беды – ул. 1-я Поселковая – ул. Восточная – ул. 1-я Базисная в г. Минске».
Сведения об этапах строительства и о сроках его реализации:
начало строительства – февраль 2020 года;
окончание строительства – март 2021 года.
Проектная документация – прошла в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Главгосстройэкспертиза» (заключение от 21.01.2020 г. № 767-15/19 и от 28.01.2020 № 807-15/19 по объекту «Жилая многоквартирная застройка в границах ул. Л. Беды – ул. 1-я Поселковая – ул. Восточная – ул. 1-я Базисная в г. Минске». 1-я очередь. Жилой дом № 1 по г/п.
Местонахождение строящегося объекта: г. Минск, в границах пер. Восточного, ул. 1-й Базисной, ул. Восточной, ул. 1-й Поселковой.
Право на земельный участок, предоставленный Застройщику – право аренды в отношении земельного участка с кадастровым номером 500000000008007061 площадью 0,4125 га для строительства объекта «Жилая многоквартирная застройка в границах ул. Л. Беды – ул. 1-я Поселковая – ул. Восточная – ул. 1-я Базисная в г. Минске».
Цена одного квадратного метра общей площади жилых помещений с учетом лоджии составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную **1400 долларам США**. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным Банком Республики Беларусь на день платежа.
Количество объектов строительства для заключения договоров – 105 единиц:
1-комнатные квартиры – 45 единиц;
2-комнатные квартиры – 45 единиц;
3-комнатные квартиры – 15 единиц.
Условия оплаты: оплата цены объекта долевого строительства производится дольщиком единовременно либо в установленный договором период по графику платежей.
По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости квартиры.
Условия возможного изменения цены строительства застройщиком в одностороннем порядке: основанием для изменения застройщиком в одностороннем порядке цены договора является нарушение дольщиком условий предоставления скидки.
Информация о процентном соотношении в строящемся объекте граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий: обязанность привлекать граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, при долевом строительстве объекта у Застройщика отсутствует.
Характеристики объекта:
16-этажный жилой дом на 110 квартир из трехслойных железобетонных панелей ОАО «Солигорский ДСК».
На первом этаже размещаются помещения общественного назначения: входной холл с зоной отдыха, зоной размещения консьержа, санузлом; лифтовой холл, коридор, помещение уборочного инвентаря, помещение сетей. В техподполье размещаются инженерные помещения и коммуникации, встроенное помещение товарищества собственников с отдельным входом через тамбур. Над жилыми этажами предусмотрено устройство теплого чердака. Высота типового жилого этаж 2,8 м, высота 1-го этажа – 3,98 м. В жилом доме не предусмотрено размещение мусоропровода.
В качестве наружной отделки стен используются фасадные панели с защитно-декоративным полимерным покрытием в системе «вентилируемых фасадов». Цоколь, бетонные стены 1-го этажа – защитно-отделочная штукатурка по утепленным поверхностям с последующей окраской акриловой краской. На фасадах – металлические конструкции для размещения кондиционеров.
Остекление – окна из поливинилхлоридного профиля с расчетным сопротивлением теплопередаче не менее 1,0 м² С/Вт. В квартирах предусмотрено устройство «французских балконов».
Здание оборудовано двумя пассажирскими лифтами грузоподъемностью 630 и 1000 кг.
Для маломобильных групп населения предусмотрено устройство пандусов для подъема в помещения общественного назначения.
Состав общего имущества многоквартирного жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам:
электрощитовая, мусорокамера, индивидуальный тепловой пункт (ИТП), помещение сетей связи, помещение уборочного инвентаря, водомерный узел, помещение колясочной на каждом жилом этаже; помещение отдыха и помещение консьержа на первом этаже, навес для хранения велосипедов, пристроенный к зданию;
элементы инженерной инфраструктуры, в том числе ограждения, стоянки, иные отдельно стоящие объекты для целевого использования многоквартирного жилого дома;
внутриквартальные инженерные сети электро-, тепло-, водоснабжения, канализации, связи, телефикации, радиофикации.
Функциональное назначение нежилых помещений в многоквартирном жилом доме, не входящих в состав общего имущества дома:
помещение для размещения штатных работников товарищества собственников.
Элементы благоустройства: с целью создания комфортной среды предусматривается комплексное благоустройство дворовых территорий, в составе которых запроектированы площадки для отдыха взрослого населения, детские игровые и физкультурные площадки, площадки для хозяйственных целей и крупногабаритного мусора.
Все расположенные на проектируемой территории площадки оборудованы в соответствии с их функциональным назначением малыми архитектурными формами.
В общую систему проездов включены открытые парковки, размещаемые на обособленных площадках.
Для покрытия проездов и парковок используется асфальтобетонная смесь, тротуаров, площадок и пешеходных дорожек – мелкоразмерная бетонная тротуарная плитка, площадок для отдыха и детских игровых площадок – мягкое резиновое покрытие.
Мероприятия по организации безбарьерной среды для физически ослабленных лиц и инвалидов включают: организацию гостевых парковок для спецтранспорта инвалидов с установкой соответствующих информационно-указательных знаков; устройство пониженного борта в местах пешеходных переходов, дублирование наружных лестниц пандусами.
Озеленение территории предусматривается на основе архитектурно-планировочного решения генплана за счет посадки декоративных деревьев и кустарников в дополнение к существующим сохраняемым зеленым насаждениям, а также устройства цветников и газонов на свободных от покрытий территориях.
Сведение о договорах строительного подряда, заключенных застройщиком: от 11 февраля 2020 г. с ОАО «Солигорский ДСК».
Условия ознакомления с информацией по проекту, порядок приема и регистрации заявлений на заключение договоров:
Ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно на сайте **www.4sezona.by**, а также в отделе продаж Застройщика «4 Сезона»: г. Минск, ул. Леонида Беды, 45, тел.: +375 29 782-07-07; +375 44 782-07-07, где также можно подать заявление на заключение договора в рабочие дни – с понедельника по пятницу; рабочие часы – понедельник – пятница с 9.00 по 17.30; обед – с 13.00 по 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Абеліскі параненай зямлі

Прастора памяці

Унікальны мемарыял памяці аб населеных пунктах Гомельшчыны, якія былі спалены разам з мірнымі жыхарамі, з'явіцца ў Светлагорскім раёне. Комплекс будзе ўзведзены на месцы былой вёскі Ала, дзе ў студзені 1944 года атрад карнікаў спаліў жывымі і расстраляў 1758 чалавек, у тым ліку 950 дзяцей.

Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Дзяніс ЯЗЕРСКІ з праектам.

Эскізная прапанова мемарыяльнага комплексу.

Вядома, што жудасны лёс светлагорскай Алы — гэта колькасць ахвяр, параўнальная 12 Хатынямі. Карнікі сагналі людзей ў дамы і гаспадарчыя пабудовы, потым падпалілі. У той час у вёсцы акрамя мясцовых знаходзіліся бежанцы з іншых пасёлкаў. Тых, хто спрабаваў уцячы, расстрэльвалі і кідалі ў агонь. Пасля вызвалення Светлагоршчыны на ўскрайку вёскі ў брацкай магіле пахавалі астанкі мірных жыхароў і целы салдатаў, што загінулі пры вызваленні мясцовасці. Вёска Ала больш не адрадзілася, аднак у 1958 годзе на месцы трагедыі ўсталявалі помнік — скульптуру салдата з вянком.

Ідэя стварэння новага мемарыяла ў Але належыць светлагорскаму паэту Ізяславу Катлярову. Летась пад Светлагорскам прайшоў пленэр скульптараў у памяць трагедыі спаленай вёскі. З велізарных валуноў мастакі стваралі скульптуры-сімвалы, якія павінны заняць асобнае месца ў будучым комплексе.

Дарэчы, у снежні мінулага года падчас сустрэчы Прэзідэнта Беларусі са студэнтамі і выкладчыкамі медуніверсітэтаў пытанне аб неабходнасці стварэння мемарыяла ў Але падняла студэнтка адной з гомельскіх ВНУ. Ініцыятыву падтрымалі на самым высокім узроўні.

— Кампазіцыйна комплекс — гэта тры блокі: уваходная група, пешаходны маршрут і мемарыяльная зона, — прадстаўляе эскіз мемарыяла, які распрацавала творчая група ААТ «Інстытут Гомельграмадзянпраект», **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Дзяніс ЯЗЕРСКІ.** — Ва ўваходнай групе на аванплошчы размесціцца сімвалічная кампазіцыя з засохлага дрэва каля вадаёма і сцяны з імёнамі ахвяр. Асобна будзе створаны абеліск з картай Гомельскай вобласці, на якой адзначаць усе спаленыя вёскі нашага рэгіёна.

Пешаходны маршрут — гэта амаль 300 метраў лясной дарогі, выкладзенай камянямі ў тым напрамку, як праходзіла галоўная вуліца былой вёскі. На месцы дамоў з'явяцца 34 стылізаваныя брамы падворкаў і абеліскі з сілуэтамі людзей. Усё будзе выканана з бетону.

У мемарыяльнай зоне абновіцца звонку існуючая брацкая магіла. Побач размесціцца званіца: колькасць званоў — па ліку вёсак, жыхары якіх загінулі ў Але, — растлумачыў Дзяніс Язерскі. — Тут жа з'явяцца стэла з набатным звонам, інфармацыйная зона, а таксама пляцоўка з імправізаванымі лавамі, на якіх будуць праходзіць урокі памяці пад адкрытым небам.

Вядома, што прыкладны кошт аб'екта — 5-6 мільёнаў рублёў. Аднак гэта будзе сапраўды «народная будоўля», адзначыў галоўны ідэолаг рэгіёна. Збор сродкаў для мемарыяла пачнецца з пераліченняў ад удзельнікаў рэгіянальнага суботніка, які пройдзе 22 лютага. Вітаецца любая дапамога ад працоўных калектываў, спонсараў і проста неабыякавых людзей. Вядома, што ініцыятыву падтрымаў БРСМ. Да будоўлі актыўна падключацца студатрады.

Ала — новы пункт прыцягнення на карце турыстычных «дарог памяці», якія звяжуць патрыятычныя маршруты праз аграгарадок Чырвоны Бераг у Жлобінскім раёне, дзе ўвекавечана памяць аб малалетніх вязнях фашысцкага донарскага канцлагера, і мемарыяльны комплекс «Багрыцёнаў», што таксама на Светлагоршчыне.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

Самі з ВУСАмі: нататкі наваспечаных вяскоўцаў

Або пан або прапаў

Як мы будаваліся па ДАВЕРанасці

Пра тое, што мы пачалі будаваць дамок у вёсцы, ведалі толькі я і муж. Бацькам вырашылі нічога не казаць раней часу. Каб не хваляваліся. Справа ў тым, што мы пачалі ўзводзіць сцены ды дах яшчэ да таго, як набылі ўчастак...



Першым у хату ўпусцілі... бусла.

Пачалося ж усё, як ні дзіўна, з капітальнага рамонту на здымнай кватэры. Мы амаль паўгода гатавалі ежу на маленькай электраплітцы, бо замена газавых труб чамусьці зацягнулася. Столькі ж прыбіралі смецце за «гора-рамонтнікамі» ды слухалі іх бясконцыя мацюкі пад вокнамі... Не, не падумайце, я не скарджуся. Хутчэй наадварот, вельмі ўдзячная лёсу. Бо менавіта дзякуючы таму няшчаснаму капрамонту мы цяпер жывём ва ўласным, хоць і невялічкім, дамку. Мала таго, што больш не чуем п'яных сварак суседзяў за сценкай, дык яшчэ і не выкідваем штомесяц ільвіную долю заробку на вецер. А ў якасці бонусу — дыхаем чыстым паветрам ды п'ём ваду без прысмаку хлоркі. Дарэчы, вуслянскую вадзічку з уласнай свідравіны мы цяпер возім з сабой у Мінск у якасці гасцінца, частуем сваіх сталічных сяброў.

Дык вось, якраз падчас чарговай навалы рамонтнікаў муж у роспачы пачаў праглядаць у інтэрнэце аб'явы аб продажы ўчасткаў. І нейкім неверагодным чынам амаль адразу ж натрапіў на здымкі з Малой Вусы. На першы погляд нічога асаблівага: 15 сотак, напалову зарослыя залатарнікам ледзь не ў рост чалавека. На ўчастку заліты фундамент 5 на 6. Але ўвагу майго Уладзя прыцягнула іншае — тое, што з участка відаць сасновы лес. Ды рэчка ў крокавай даступнасці. І ўсё гэта каштуе крыху больш за дзве тысячы беларускіх рублёў. Шчыра прызнацца, мы думалі, што такіх цэн ужо не існуе, улічваючы, што па вёсцы ідзе газ.

Па волі лёсу муж быў першы, хто патэлефанаваў гаспадару таго ўчастка. І ў той жа дзень паехаў на агледзіны. Вярнуўся ўзрушаны, з кучай здымкаў ды відэазапісаў на тэлефоне. «Уяўляеш, там такі шыкоўны лес прасціраецца на 15 кіламетраў. Можна будзе ў грыбы хадзіць хоць штодзень і дыхаць гаючым сасновым паветрам. Будзем жыць як на курорце». Карацей, у яго не было ніякіх сумненняў — «трэба браць».

Назаўтра мы разам з Уладзімірам (гаспадаром участка) паехалі ў райвыканкам, каб пракансультавацца, як лепш афарміць здзелку. Я засталася чакаць мужчын у машыне. Дзесьці хвілін праз дваццаць яны вярнуліся з роспачу на тварах. Аказваецца, былы ваенны пратэрмінаваў сваё будаўніцтва. І калі на працягу двух месяцаў не ўзвядзе сцены ды дах, то дзяржава забярэ ў яго ўчастак. Прадаваць адзін фундамент ён не мае права па законе.

Уладзімір шчыра прызнаўся, што будаваць нічога не збіраецца. Раней хацеў тут узвесці невялічкую лазню, каб з сябрамі прыязджаць парыцца. Але рукі так і не дайшлі. А нядаўна памерла маці. У спадчыну застаўся бацькоўскі дом з участкам у Слуцкім раёне. «Мяне аднаго на ўсё не хопіць. Вось і вырашыў прадаць вуслянскі ўчастак, а тут такая неспадзянка...» У выніку Уладзімір прапанаваў нам аператыўна ўзводзіць сцены ды дах ад яго імя, па даверанасці, каб да канца лета афіцыйна аформіць здзелку куплі-продажу.

Калі б не скарысталіся парадай Уладзіміра Караткевіча, магчыма, дагэтуль бы здымалі кватэру.

Перш чым прыняць рашэнне, я захацела пабачыць участак на свае вочы. І ў мяне, як і ў мужа, адбылася любоў з першага погляду. Падумалі, што або пан або прапаў. І рызыкнулі. У той жа дзень паехалі да натарыуса і афармілі даверанасць на імя майго Уладзя — і, як бачыце, інтуіцыя нас не падвяла. Гаспадар участка аказаўся чалавекам слова, стрымаў абяцанне. Хоць, калі мы апавядаем сваю гісторыю сябрам, тыя шчыра здзіўляюцца. «Ну вы і рызыкоўныя, паверыць чалавеку, якога першы раз бачыце... Ён жа мог, убачыўшы гатовы дамок, перадумаць прадаваць участак, і нічога б не даказалі». Не ведаю, ці вырашылася б я на такі крок зараз. Але тады ў мяне, цяжарнай, нават сумневаў не было, што ўсё атрымаецца.

Цяпер многія здзіўляюцца, чаму мы вырашылі пабудаваць такі маленькі дамок. А ўсё вельмі проста: у праекце, які зацвярджаў ранейшы гаспадар, быў заяўлены дом з фундаментам 5 на 6. Мы проста не мелі права выходзіць за яго межы. Але я да гэтага стаўлюся па-філасофску. Па-першае, вялікі дом патрабуе вялікіх фінансавых укладанняў і, адпаведна, часу. А нам важна было як мага хутчэй з'ехаць са здымнай кватэры. Па-другое, да дома з часам можна зрабіць прыбудову — былі б грошы ды жаданне. Галоўнае, як па мне, выбраць месца па душы. Бо, пагадзіцеся, чыстае паветра, рэчку ды лес пасля, каб і хацеў, не намалюеш ні за якія грошы. Гэта як з адносінамі. Людзі часам, звязваючы свой лёс з іншым чалавекам, звяртаюць увагу не на тое, не на асноўнае. Не на душэўныя якасці, а на знешні выгляд ды таўшчыню кашалька, напрыклад. А потым кусаюць сабе локці...

Днямі паглядзела біяграфічны фільм «Модзі». Там да галоўнай гераіні, якая праславілася дзякуючы сваім карцінам, прыехаў брат. Ён паглядзеў на маленькі ды просценькі дамок, дзе яна жыве са сваім мужам, развозчыкам рыбы, і сказаў: «У цябе зараз хапае грошай. Чаму б вам не купіць лепшы дом?» — «Навошта нам так рабіць, — пачуў ён у адказ. — Гэты дом прынёс радасць».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК. Фота аўтара.

Не прайсці міма

РАЗБУРАЮЦЬ ГНЁЗДЫ? СІГНАЛІЗУЙЦЕ!

За гэта цяпер будзе пагражаць буйны штраф

У грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» папярэджваюць: з 16 лютага па 14 жніўня асаблівая ўвага будзе нададзена ахове гнёздаў гракоў і іншых птушак.

— У калоніях гракоў у іх гнёздах (ды і ў гнёздах варон і сарок таксама) могуць гнездавацца драпежныя птушкі: дробныя совы і сокалы. Напрыклад, вушатыя совы займаюць гнездавыя ўчасткі, адкладаюць яйкі і выхоўваюць птушанят нават раней за гракоў, — расказвае **спецыяліст па прыродаахоўных пытаннях АПБ Максім НЯМЧЫНАЎ.** — *Пры гэтым драпежныя птушкі, асабліва совы, часта застаюцца незаўважнымі. Таму ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб жывёльным свеце» былі ўнесеныя змены, і цяпер, каб не турбаваць птушак і не знішчаць іх дзетак разам з гнёздамі, дзейнічае забарона на знішчэнне гнёздаў ужо з 16 лютага.*

Што рабіць, калі пасля 15 лютага заўважыш, што нехта скідае і разбурае гнёзды?

Можна пазваніць у Мінпрыроды на гарачую лінію ці пакінуць электроннае паведамленне на сайце свайго абласнога або Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Трэба паведаміць дату і месца здарэння, пастарацца зрабіць фота ці запісаць відэа. Варта зняць нумар пад'ёмніка і іншых машын, калі адбываецца абрэзка дрэваў з дапамогай такой тэхнікі. Калі магчыма, зафіксуйце, што знаходзіцца ў гнёздах. Здыміце на фота надпісы на спецвопратцы людзей. Чым больш інфармацыі і доказаў, тым лепш.

Кругласутачны тэлефон дзяжурнага эколага Мінпрыроды: 8 017-267-55-70.

Пасля 15 лютага абразанне галінаў з гнёздамі пагражае штрафамі. АПБ просіць паведамляць пра такія парушэнні.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Праект, які натхняе

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Першыя рэкламныя канструкцыі каля пад'ездаў дамоў з'явіліся ў Беразіно, і з цягам часу прадпрымальнікі зразумелі, што іх праект карысны для выканкамаў і ЖКГ, і сталі рухацца далей у гэтым кірунку. На сёння ў 25 раённых цэнтрах Беларусі размешчана ўжо 4500 інфармацыйных дошак. За іх установу насельніцтва нічога не плаціла, уласна кажучы, таксама як камунальнікі і мясцовыя ўлады. Менавіта іх аб'явы размяшчаюцца бясплатна, як і інфармацыя з UNIHELP і іншых карысных крыніц, плату прадпрымальнікі бяруць толькі з камерцыйных рэкламадаўцаў. Дарэчы, прапаноўваюць ім таннейшую паслугу, за якую нельга атрымаць штраф.

— Напрыклад, калі крама прапаноўвае свае тавары, мы размяшчаем іх буклеты. На такіх стэндах можна ўбачыць рэкламу мясцовых прадпрымальнікаў, якія дагэтуль пакідалі яе ў паштовых скрынках, — нашы канструкцыі дазваляюць людзям паглядзець, пачытаць і ўзяць нейкі матэрыял з сабой, — дзеліцца Дзмітрый. — Камусьці наш праект можа здавацца камерцыйным, але гэта не зусім так. Так, мы зарабляем нейкія грошы, і гэта нядрэнна, але асноўная наша задача заключаецца ў тым, каб зрабіць рэкламу цывілізаванай.

ТРАЦІМ, НЕ ЗАДУМВАЮЧЫСЯ

Наўрад ці нехта пачне спрачацца, што бясконцыя аб'явы і рэклама ў пад'ездах, на слупах і прыпынках толькі раздражняюць. Але гэта яшчэ паўбяды — на ўпарадкаванне пасля прыклееных паперак выдаткоўваюцца велізарныя сродкі.

У Беларусі 118 раённых цэнтраў без уліку Мінска і абласных цэнтраў. Калі замяніць усе ўваходныя дзверы, якія былі сапсаваны рэкламай, спатрэбіцца 70 мільёнаў рублёў. Але ўсё гэта будзе дарэмна, таму што назаўтра дзверы пашкодзяць ізноў. Дарэчы, на гэтыя грошы можна было б дапамагчы шматдзетным сем'ям (на гэты кірунак у 2019 годзе выдаткавалі больш за 30 мільёнаў рублёў), выдзеліць іх на развіццё прафесійна-тэхнічнай і сярэднеспецыяльнай адукацыі (46 мільёнаў рублёў — летась). 70 мільёнаў — гэта таксама 7 % ад бюджэту дзяржавы, які траціцца на забеспячэнне медыцынскай дапамогі. А калі сюды дадаць Мінск і абласныя цэнтры, то выніковую суму можна смела павялічваць у два разы!

— Канешне, штогод дзверы мяняць не абавязкова, але іх фарбаванне таксама нечага каштуе — плошча, якую трэба будзе пафарбаваць толькі ў раённых цэнтрах, складзе 60 стадыёнаў «Дынама»! А гэта мінімум 600 тысяч рублёў! — разважае прадпрымальнік.

І вось калі да гэтай сумы прыплюсаваць апоры асвятлення... Толькі ў невялікім горадзе на фарбаванне слупоў, якія знаходзяцца на дзвюх цэнтральных вуліцах горада, трацяць 1200 рублёў. А калі палічыць толькі цэнтральныя вуліцы ўсіх раённых цэнтраў, то сума затрат павялічыцца да 140 тысяч. Яшчэ 60 тысяч ідзе на пафарбоўку прыпынкаў гарадскога транспарту, а колькі сродкаў выдаткоўваецца на аднаўленне тых жа пад'ездаў?

— Акрамя таго, ніхто не штрафуе нядобрасумленных грамадзян, якія расклейваюць гэтую рэкламу, дзе ім захочацца. А гэта ж таксама грошы! Калі ў адным горадзе будзе 10—15 парушэнняў, то ў ім недалічацца каля 25 тысяч рублёў, а дзяржава цалкам — тры мільёны, — лічыць Дзмітрый. — Гэта 3 % ад сумы штрафаў па ўсёй краіне, а калі мы дададзім Мінск і абласныя цэнтры, то можа быць нават 8—10 %. І нягледзячы на гэта наш пад'езд кожны дзень працягваюць закідваць рэкламай.

НЯВЫГАДНЫЯ ЗНОСІНЫ

Лічбы немаленькія, і некаторыя мясцовыя ўлады пачалі бачыць ва ўпарадкаванні стыхійнай рэкламы пэўную выгаду. У той ці іншы раённы цэнтр Лабковічы са сваім праектам трапляюць толькі праз выканкам і ўжо пасля размовы з прадстаўнікамі ўлад заключаюць дагавор з мясцовай арганізацыяй ЖКГ. Здаецца, нічога складанага — камунальнікі дазваляюць ім ставіць стэнды каля пад'ездаў, а прадпрымальнікі сочаць за чысцінёй і падтрымліваюць парадак...

— Але не заўсёды нам дазваляюць рабіць гэта бясплатна, дзесьці мы вымушаны плаціць арэнду, пры гэтым прадпрыемства ЖКГ ці таварыства ўласнікаў устанаўліваюць свае тарыфы, хоць браць грошы за гэта нават не зусім законна, — кажа Дзмітрый. — За свой кошт мы ставім канструкцыі, абслугоўваем іх, бясплатна размяшчаем інфармацыю ад мясцовых улад, ЖКГ і іншых дзяржаўных службаў, але ўсё роўна застаёмся вінны.

Напрыклад, у Слуцку прадпрымальнікі штомесяц аддаюць 200 рублёў за размяшчэнне 200 канструкцый і ўжо ў гэтым нясуць страты. А ў Наваполацку за размяшчэнне 200 канструкцый мясцовыя ўлады агучылі суму ў 2600 рублёў... «Зразумела, што мы туды не прыйшлі», — кажа Дзмітрый Лабковіч.

І вось тут ужо трэба задумацца. Магчыма, мясцовыя жыхары былі б і не супраць навесці парадак у пад'ездах і пазбавіцца ад надакучлівай рэкламы, але ім нават не далі ўбачыць гэтую магчымасць...

ДЗІЦЯЧАЯ ГУЛЬНЯ

Сацыяльны праект Лабковічаў часта трапляе «ў мінус», але не толькі з-за арэндnай платы — канструкцыі часта ламаюць. У міліцыю прадпрымальнікі ніколі не звярталіся, і, па словах Дзмітрыя, калі б гэтым праектам займаліся арганізацыі ЖКГ, то ў іх нічога не атрымалася б — яны б толькі страчвалі больш грошай з-за вандалізму.

— У Жодзіне мы ўстанавілі 200 канструкцый, і роўна праз два тыдні гэтыя 200 канструкцый нам сапсавалі. Але мы ўсё аднавілі. Іх і цяпер ломяць штомесяц у кожным раённым цэнтры, — дзеліцца прадпрымальнік. — Каб гэтага не было, людзям не толькі трэба даць цывілізаваныя крыніцы рэкламы, але і штрафаваць нядобрасумленных рэкламадаўцаў.

У Кітаі гэтую праблему вырашылі яшчэ 30 гадоў таму — спецыялісты пэўнай службы сачылі за нядобрасумленнай рэкламай, і нумары тэлефонаў з такіх аб'яў адпраўлялі робату, які кожныя дзве хвіліны тэлефанаваў ім і паведамляў аб парушэнні закона. У выніку рэкламадаўцы проста страчвалі свой нумар тэлефона.

— Мы прапанавалі адаптаваць іх вопыт пад нашу краіну і распрацаваць мабільную праграму, якой змогуць карыстацца нават дзеці, — кажа Дзмітрый. — Працэс будзе пабудаваны ў выглядзе гульні — дзеці будуць гуляць па горадзе праз дапоўненую рэальнасць і «лавіць» несанкцыянаваную рэкламу з дапамогай свайго смартфона.

Калі пэўны персанаж (у праграме. — **«Зв.»**) «зловіць» такую аб'яву, яе фота і месцазнаходжанне адразу трапяць да прадпрымальнікаў. Тыя ўпэўняцца, што нумар належыць таму ці іншаму рэкламадаўцу, а потым перададуць яго кантакты робату, які будзе працаваць па той жа схеме, што і кітайскі.

— Стэнды — гэта альтэрнатыўная крыніца рэкламы, якая нешта дае дзяржаве, людзям і прадпрымальнікам, а для таго, хто не разумее, мы хочам стварыць такую гульню, каб у кожным пункце Беларусі людзі захацелі дапамагчы зрабіць іх горад чысцейшым, — разважае Дзмітрый Лабковіч.

РЭСПУБЛІКАНСКІ МАШТАБ

Але трэба разумець, што распрацоўка такой гульні нямала каштуе. Дзеля таго прадпрымальнікі і вырашылі ўзяць удзел у конкурсе праектаў, які фінансуе інавацыйны фонд Мінаблвыканкама. Тым больш менавіта гэты конкурс можа даць ім магчымасць распаўсюдзіць ініцыятыву на ўсю Беларусь.

— І гэта рэальна, але без падтрымкі дзяржавы і мясцовых улад нічога не атрымаецца, — тлумачыць прадпрымальнік. — Бізнес-план можна будзе рэалізаваць толькі ў тым выпадку, калі не будзе бюракратычных перашкод і з нас не будуць браць арэндную плату. Тым больш што сёння не існуе такой стаўкі, а кошт паслугі некаторыя проста бяруць з галавы, і ён атрымліваецца касмічны.

Калі дзяржава ацэніць гэты праект і яго сацыяльную ролю, то прадпрымальнікі змогуць стварыць рабочыя месцы (у некаторых гарадах абслугоўваннем стэндаў займаюцца мясцовыя жыхары. — **«Зв.»**), дапамогуць знізіць затраты на ўтрыманне пад'ездаў, дадуць магчымасць захаваць новабудоўлі і павялічаць прыток сродкаў у бюджэт за кошт штрафаў. Але галоўнае тут, што наша краіна стане чысцейшай і ў насельніцтва нарэшце з'явіцца крыніца цывілізаванай рэкламы.

— Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў выказаў думку, што такія інфармацыйныя дошкі — найлепшая лакацыя для таго, каб інфармаваць насельніцтва пра неабходнасць раздзяляць адходы, — лічыць Дзмітрый Лабковіч. — Тое ж датычыцца і мясцовых улад, ЖКГ, МНС. Тыя ж цэнтры занятасці могуць інфармаваць людзей пра вакансіі, бо, як паказала практыка, гандлёвыя сеткі праз нас заўсёды знаходзілі сабе супрацоўнікаў. І канешне, хацелася б атрымаць цывілізаваны падыход у гэтым кірунку ад іх усіх.

Па падліках прадпрымальнікаў, за пяць гадоў дзейнасці праект дазволіць сэканоміць больш за 900 тысяч рублёў, а 66 мільёнаў не спатрэбіцца траціць на аднаўленне пад'ездаў, слупоў ды прыпынкаў.

— Акрамя таго, насельніцтва атрымае якасныя інфармацыйныя паслугі, у Беларусі з'явіцца як мінімум сто новых рабочых месцаў, а дзяржава атрымае дадатковы даход праз штрафы, — лічыць Дзмітрый.

БЯСКОНЦЫ ПОШУК

Сацыяльныя праекты, як правіла, адбіраюць не толькі шмат часу і сродкаў, але і жаданне працаваць у гэтым кірунку. Але гэта зусім не перашкаджала маладой сям'і — у яе жыцці пастаянна адбываліся падзеі, якія прымушалі рухацца далей. Летась гэта была перамога ў конкурсе «Малады лідар Міншчыны», а сёння гэта конкурс інавацыйных праектаў ад Мінаблвыканкама.

— Аднойчы, калі была думка адмовіцца ад праекта, я вырашыў патэлефанаваць міністру жыллёва-камунальнай гаспадаркі і да апошняга думаў, што ўсе гэтыя прамыя тэлефонныя лініі — падман, нават не разлічваў, што міністр возьме трубку, яшчэ перапытваў яго, ці сапраўды гэта ён, — усміхаецца прадпрымальнік. — Але міністр здзівіўся не менш, што я звярнуўся да яго з прапановай, а не са скаргай. Пазней нас запрасілі ў міністэрства, і пасля гэтай сустрэчы новую дарогу нам адкрыў журналіст іх ведамаснага выдання.

Пасля гэтага праект Лабковічаў падтрымаў беларускі музыкант Валерый Дайнека, а потым прадпрымальнікі перамаглі ў трох намінацыях конкурсу «Лепшыя тавары Беларусі». Шмат сіл і натхнення ўдалося атрымаць і на конкурсе Social Weekend у 2019 годзе.

— Мы дайшлі толькі да паўфіналу, але гэта было цудоўна! Мы сустрэлі шмат цікавых людзей, якія падзяліліся з намі сваім вопытам, думкамі наконт нашага праекта, а галоўнае — мы ўбачылі, што наш праект патрэбны людзям, што ім зусім не падабаецца рэклама на слупах, прыпынках і ў пад'ездах, — дзеліцца Дзмітрый. — Гэта відаць і па тым, як мясцовыя жыхары ставяцца да нашых стэндаў, — аднойчы нейкі мужчына праганяў мяне ад іх з дапамогай моцных слоў, думаў, што я хачу сапсаваць дошкі, а адна бабуля самастойна спрабавала адрамантаваць нашы канструкцыі. І вось тут зразумела толькі адно — людзі не хочуць жыць сярод рэкламы, якой завалены ўсе пад'езды.

* * *

І тут няма нічога дзіўнага — кожны з нас хоча жыць у чысціні. Дзіўна іншае — што знайшліся людзі, якія пажадалі нам у гэтым дапамагчы. Проста так. І гэта сапраўды цуд. Бо для іх прадпрымальнікі, як сказаў Дзмітрый, не проста людзі, якія зарабляюць грошы, а тыя, хто павінен нешта добрае рабіць для людзей.

Валерыя КІСЛАЯ. Фота з архіва Дзмітрыя ЛАБКОВІЧА.

Каманда, якая працуе над праектам.

20 марта 2020 года в 14.00 в актовом зале общества состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Вишневка-2010» с повесткой дня:

1. «Об итогах развития ОАО «Вишневка-2010» за 2019 год и задачах по обеспечению выполнения показателей прогноза социально-экономического развития на 2020 год».
2. «Отчет Наблюдательного совета ОАО «Вишневка-2010» о работе в 2019 году».
3. «Отчет ревизионной комиссии ОАО «Вишневка-2010» о работе в 2019 году». Рассмотрение аудиторского заключения по итогам проведения ежегодного аудита общества за 2019 год».
4. «Об утверждении годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках ОАО «Вишневка-2010» за 2019 год».
5. «Распределение прибыли общества за 2019 год».
6. «План распределения прибыли общества за 2019 год».
7. «Избрание членов Наблюдательного совета ОАО «Вишневка-2010».
8. «Избрание членов ревизионной комиссии ОАО «Вишневка-2010».
9. «Утверждение размера материального вознаграждения членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Вишневка-2010».

Регистрация участников общего собрания акционеров будет осуществляться 20 марта 2020 года с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации необходимо иметь при себе: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по месту нахождения общества (Минский район, а. г. Вишневка, ул. Центральная, д. 1А) с 08.00 до 17.00 с 10 по 19 марта 2020 года.

УНП 600041880

Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі глыбока смуткуе з нагоды заўчаснай смерці намесніка старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі МІКШЫ Аляксандра Сяргеевіча і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе з нагоды смерці намесніка старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі МІКШЫ Аляксандра Сяргеевіча і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

ШТО СКАЗАЎ БЫ ПАРАХОНЦАМ АЛЯКСАНДР БЛОК?

Адна з найбольш моцных айчынных гаспадарак – ААТ «Парахонскае» – пабудавана на меліяраваных землях у Пінскім раёне. Спецыялізуецца на вытворчасці мяса і малака. Калі вы захочаце паглядзець на граматна арганізаваную буйнатаварную вытворчасць прадукцыі жывёлагадоўлі – вам у «Парахонскае». Пры ўсіх перападах нашага неспакойнага клімату, ад чаго залежаць і ўраджайнасць, і кармы, і шмат іншага, тут пастаянна дэманструюць высокія вынікі. Растуць заробкі вяскоўцаў – жыхароў аграгарадка і іншых вёсак, развіваецца сацыяльная сфера. Высокую ацэнку гаспадарчай дзейнасці славутага саўгаса, а цяпер акцыянернага таварыства падчас візіту ў Парахонск даў Прэзідэнт.

Дырэктар ААТ «Парахонскае» Уладзімір ХРАЛЕНКА знаёміць з планам гаспадаркі.

Навіна апошніх месяцаў – дырэктар «Парахонскага» **Уладзімір Фёдаравіч ХРАЛЕНКА** абраны ў Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

– Давайце пачнём нашу размову, Уладзімір Фёдаравіч, з вашага вылучэння ў сенатары. Што паспелі зрабіць у новай для сябе якасці?

– Паспеў увайсці ў склад камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах верхняй палаты парламента. Сам папрасіўся, гэта тое, што мне бліжэй. Пачынаю прыглядвацца і да астатніх кірункаў дзейнасці. У акрузе пастаянна праводзяцца грамадска значныя мерапрыемствы, бяру ўдзел. Мяне вылучалі два раёны – Іванаўскі і Пінскі. Абодва, што называецца, не праблемныя, сельскагаспадарчая вытворчасць на ўзроўні, рухаюцца ў першых радах. Раёны ў цэлым з моцнымі кадрамі і наогул добрымі людзьмі, і ў сваім рэгіёне я кантактую з кіраўніцтвам і ўсімі дырэктарамі гаспадарак – гэта калегі, якія пастаўляюць мне жывёлу для адкорму. Часта бываем адно ў аднаго па абмене вопытам, вучымся адно ў аднаго.

Пачаў весці прыём грамадзян у якасці сенатара. Людзі прыходзяць не абавязкова ў прыёмныя дні і часы – нікога не адпраўляем, слухаем і стараемся дапамагчы. У асноўным звяртаюцца з бытавымі пытаннямі. Калі магу вырашыць – стараюся гэта зрабіць. Калі не – падключаем уладу. Тым больш што яе прадстаўнікі ідуць насустрач і падтрымліваюць.

– Нейкія мясцовыя праблемы, якія давядзецца вырашаць, ужо сталі відавочныя?

– Вялікіх праблем пакуль не бачу, некаторыя пытанні ўзаемадзеяння мы са старшынёй Пінскага райвыканкама Ігарам Максімавічам Брылевічам абмеркавалі. У прыватнасці, тэму добраўпарадкавання аграгарадка, тым больш што сёлета раён будзе праводзіць тут свята да Дня незалежнасці і патрэбна пэўная «шліфоўка» вуліц, будынкаў. Знешняму выгляду аграгарадка пастаянна ўдзяляем увагу і мы, і раён. Нядаўна пры дапамозе ПМК-4 трэста «Брэстаблдарбуд» пабудавалі з падтрымкай раённага бюджэту каля трох кіламетраў новай дарогі, на наступны год запланавана яшчэ кіламетраў дзесяць. І самі кожны год выконваем у гаспадарцы больш за шэсць кіламетраў гравійна-шчэбеневых дарог.

Такім жа чынам за апошнія чатыры гады пабудавалі кіламетраў пятнаццаць унутрыгаспадарчых дарог. Сёлета мы з дапамогай райвыканкама палепшылі дарогу і на далучаныя да нас тэрыторыі. Выходзілі на разнастайныя інстанцыі, каб зрабіць пераезд цераз чыгунку. Дзякуй гаспадарам сталёвых магістраляў – пайшлі насустрач. Лагістыка атрымалася зусім іншая.

Больш за ўсё планаў па сельскай гаспадарцы. «Парахонскае» да апошняга часу давала больш за 35 працэнтаў валавога прадукту раёна. Канчатковых агульных вынікаў па годзе пакуль няма, але лічба можа быць крыху меншая. Не таму, што мы знізілі тэмпы, проста сам раён больш «дабавіў», сур'ёзна прасунуўся наперад па вытворчасці прадукцыі раслінаводства і малака.

Тым не менш свае паказчыкі мы павялічылі, у мінулым 2019 годзе ўпершыню надаілі больш за восем тысяч кілаграмаў малака на карову. Прадалі каля 40 тысяч тон малака, фактычна ўсё гатункам «Экстра», і больш за шэсць тысяч тон мяса. Эканоміка яшчэ больш «падужэла», хоць ніколі слабая не была.

– Мы з вамі не бачыліся з восені 2014 года, пяць з паловай гадоў. Што за гэты час з'явілася новага – у вытворчасці, тэхналогіях, сацыяльнай сферы?

– У апошнія гады ў нас дабавілася каля 4000 гектараў зямлі, цяпер маем 18 380 гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў. Мы нарасцілі пагалоўе жывёлы тысячы на дзве, і сёння ў нас каля 25 тысяч. Пабудавалі некалькі вытворчых памяшканняў. А інвестары ўзвялі дзве буйныя біягазавыя ўстаноўкі для камбінаванай вытворчасці цеплавой і электраэнергіі на вытворчыя патрэбы, яны працуюць на гноі буйной рагатай жывёлы.

У нас па-ранейшаму самая высокая ў рэспубліцы шчыльнасць пагалоўя. Праўда, гэтая лічба апошнім часам крыху змянілася: было 1,6 галавы на гектар, а цяпер менш, бо мы не дабавілі столькі пагалоўя, колькі зямель. А ўвогуле алгарытм такі: дабаўляем зямлі – дабаўляем і жывёлу. Выйшлі на пяцітысячны паказчык пагалоўя фуражных кароў, да канца года будзе 5500. Дабаўляем жывёлу – адначасова нарошчваем прадукцыйнасць статка. Так і рухаемся крок за крокам, кожны год за апошні час назіраецца рост валавой прадукцыі недзе да 10 працэнтаў.

У сацыяльнай сферы – пабудавалі некалькі жылых дамоў і купілі некалькі гатовых кватэр для сваіх работнікаў. Многія сем'і пабудавалі ўласнае жыллё з дапамогай крэдытаў. Калі ўзводзяць жыллё, значыць думаюць тут жыць – і самі, і каб дзеці жылі. Харошыя будуюць дамы – вялікія, прыгожыя, са сваім архітэктурным абліччам.

– Новая з'ява: калі раней чакалі, што дамок дасць дырэктар, то цяпер будуюць самі. Чым тлумачыцца?

– Будаўнічы бум захапіў нашых працаўнікоў, людзі ўзвялі на адведзеных ім тэрыторыях і летась прынялі ў эксплуатацыю 16 домікаў катэджнага тыпу. А калі браць тэрыторыю сельсавета, то 25. У хуткім часе дабавіцца яшчэ 16. Адны будавалі з падтрымкай дзяржавы, іншыя самі. І выдзяляюцца новыя ўчасткі.

Прадстаўляем суразмоўніка

Нарадзіўся Уладзімір Фёдаравіч у 1963 годзе на Браншчыне, з 1980 года – у Беларусі. Жартуе: я беларус з вялікім, саракагадовым, стажам.

Закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Працаваў на Гомельшчыне на розных пасадах. Гаспадаркі ў той час не мелі жылля для маладога спецыяліста, на руках якога было двое зусім маленькіх дзетак, таму з 1987 года перабраўся з сям'ёй на радзіму жонкі – Піншчыну.

Працаваў галоўным аграномам калгаса імя Калініна ў Сошне і ў знакамітым «Аснежыцкім», мае вопыт агранома па кормавытворчасці і меліярацыі, што актуальна для рэгіёна, а таксама старшыні сельвыканкама. Больш за дваццаць гадоў узначальвае ААТ «Парахонскае».

Калектыў, якім ён кіруе, неаднойчы заносіўся на Рэспубліканскую дошку гонару і Дошку гонару Брэсцкага аблвыканкама.

Выбіраўся ў склад Пінскага раённага Савета дэпутатаў і Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў.

У 2019 годзе абраны ў Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Жанаты, выхоўвае траіх дзяцей.

Падтрымка з боку дзяржавы адчуваецца вялікая, асабліва шматдзетных сем'яў, што аблягчае людзям задачу. Ім трэба будзе выплаціць толькі пяць працэнтаў ад кошту жылля, і то на працягу дваццаці гадоў.

А іншыя вяскоўцы паглядзелі: чаму не будавацца, калі работу – даюць, зарплата – дастойная і прыкметна расце, летась выйшлі на сярэднія 950 рублёў. Праўда, лічым, што ўсё роўна недастаткова. Прыкінулі свае фінансавыя патокі і са студзеня павялічваем яшчэ на 20 працэнтаў. Не кожнае прадпрыемства можа сабе дазволіць. Гэта не азначае, што дабавіцца па прынцыпе ўраўнілаўкі. Недзе падцягваем – для нізкааплатных катэгорый, а для асабліва адказных відаў работ будзе і крышку больш, павелічэнне чакаецца да 30 працэнтаў. Так што разлічваем у сярэднім сёлета выйсці стабільна на 1100 рублёў.

Людзі прыцаніліся таксама, што ў гаспадарцы ўсё ёсць у плане сацыяльнай інфраструктуры – бальніца, дзіцячы сад цудоўны, школа адна з лепшых у раёне, музычная і спартыўная школы, і з кожным годам гэта ўсё развіваецца, удасканальваецца. Робяцца дарогі, ідзе прырост насельніцтва. Невялікі, але тым не менш. Памаладзела вёска. Мы захавалі сацыяльныя выплаты, пры нараджэнні дзіцяці дапамагаем сям'і ў памеры 25 працэнтаў мінімальнай зарплаты. На працягу апошніх дзесяці гадоў стабільна выплачваецца трынаццатая зарплата. Чаму не жыць?

Сацыяльная ўпарадкаванасць і забяспечанасць станоўча ўплывае на вытворчыя паказчыкі. У сваю чаргу, эканоміка дазваляе развівацца далей. Мы шмат будуем. Летась пачалі ўзводзіць ферму на 1000 галоў малочнага статку і ўжо працэнтаў на 70 зрабілі. Перабудоўваем вытворчыя памяшканні, бо пасля дзесятка гадоў эксплуатацыі ў агрэсіўным асяроддзі любая ферма мае патрэбу ў рамонце, а то і рэканструкцыі. Таму кожны месяц здаём у эксплуатацыю два абноўленыя



Работнікі комплексу па дарошчванню і адкорму аддзялення № 5 Людміла КУДЗІНА і Таццяна БАНЦЭВІЧ – гаспадыні на сваім участку.

памяшканні для жывёлы, запускаем туды новых пастаяльцаў. Побач з капітальнымі будынкамі ўзводзім навесы для ўтрымання жывёлы – ёй на свежым паветры нават камфортней, толькі б «за каўнер» не цякло. Свой стратэгічны мяса-малочны кірунак вытрымліваем, даход ад малака і мяса прыкладна аднолькавы. Па мясе рэнтабельнасць невялікая, а вось па «белым золаце» працэнт даволі сур'ёзны. У выніку адно другое дапаўняе.

Сваю аддачу прыносіць насенняводства, таксама наша самастойная галіна.

– «Парахонскае» задумвалася як самая буйная фабрыка мяса і малака ў Савецкім Саюзе на меліяраваных землях. Ці атрымалася?

– Яно і засталося найбуйнейшым вытворцам мяса і малака на абноўленых землях. Летась па вытворчасці малака і мяса мы ўпэўнена занялі другое месца ў краіне.

– Вы прынялі пад сваё «крыло» суседнюю, слабейшую гаспадарку, раскажыце больш падрабязна. Цікавы і карысны вопыт.

– Гэта «Сошненскае», таксама размешчанае на меліяраваных землях, калісьці я там працаваў галоўным аграномам. У свой час гаспадарка была тварам раёна. Цяпер нам з нашым пагалоўем спатрэбіўся дадатковы аб'ём зямель. Рэзка памяняліся ўмовы надвор'я, і сямігадовы засушлівы перыяд прывёў да таго, што пачалі думаць пра запас трываласці. А суседзі не паспявалі апрацоўваць свае плошчы належным чынам, не было поўнага набору тэхнікі, людскіх рэсурсаў. І райвыканкам прыняў рашэнне. Першапачаткова нам перадалі частку

Машыніст аўтагідрапад'ёмніка Алег МУЗЫКА.

Начальнік комплексу Алена БОНДЗІЧ у памяшканні для даення малочнага статка.

някоў. Будзем рэканструяваць па такім прынцыпе яшчэ адзін будынак. Яны параўнальна танныя, адно месца значна таннейшае, чым на іншых комплексах. А галоўнае, яны тэхналагічныя, можна «выкласці» кармавы стол у поўным аб'ёме. І хапае месца, ніхто не адганяе ад корму, не штурхаецца. Жывёла дасць прывагі тады, калі ёй камфортна.

З 300–500 грамаў прывагі бычкоў, што тут атрымлівалі раней, дасягнулі 1 кілаграм 200 грамаў сярэднесутачных прыраў на жывёлу.

Ці правільна мы ўсё разлічылі? Толькі на рэканструкцыю адкормачнікаў (матэрыялы, зарплата, падаткі) затрацілі мільён рублёў новымі. Стаяла там 1100 быкоў. Здалі першую партыю, зарабілі 500 тысяч. Праз два месяцы здаём «насельнікаў» яшчэ аднаго будынка, таксама заробім 500 тысяч рублёў. Так што цалкам вернем той мільён, што раней укладлі ў рэканструкцыю. А далей будзем працаваць на прыбытку.

Адным словам, тое, што было ў Дубнавічах раней, і што цяпер – неба і зямля. Жыхары мясцовых вёсак таксама адчулі розніцу.

Ужо цяпер у нядаўна ўзведзеных будынках фермы новага фармату ў Дубнавічах тысячу быкоў даглядаюць толькі тры чалавекі. Дапамагае поўная механізацыя працэсаў. У такім будынку светла, шмат сонца і паветра. Бакавыя сцены не з цэглы ці блокаў, а з лісцавога полікарбанату, які таннейшы за цэглу ў тры разы, прычым прапускае святло, трымае цяпло, памяшканне абароненае ад скразмельскія збожжаўборачныя камбайны, два УЭС – гомельскія касілкі.

– У апошні наш прыезд у вас было, здаецца, дзесяць жывёлагадоўчых комплексаў...

– Усе працуюць і «прырастаюць», сёлета будзе трынаццаць. Дабавіліся комплексы, якія я прыняў ад суседзяў. Адзін мы рэканструявалі, яшчэ адзін пабудуем сёлета. І трэці – там стаіць недзе 400 галоў, але праз год будзе паўтары тысячы быкоў. Усяго будынкаў, дзе ўтрымліваюцца быкі, у нас каля сарака.

У памяшканні комплексу чысціння і парадак. Напаўненнем паілак камандуе аўтаматыка.

– У вас не так даўно было 20 тысяч галоў жывёлы...

– Зараз 24 з паловай. Няма таго года, каб мы не прасунуліся наперад па пагалоўі і прадукцыйнасці.

Што датычыцца надояў, то ў нас няма сезоннасці, жывёла на стойлавым утрыманні, доім кожны дзень у залежнасці толькі ад расцёлаў. І нейкай цыклічнасці ў залежнасці ад пары года няма. Надоі складалі ў розны час ад 22 да 25 кілаграмаў малака ад каровы.

Адбылося генетычнае паляпшэнне статка. У тым ліку за кошт яго абнаўлення каровамі галшцінскай пароды, цяпер іх амаль 70 працэнтаў.

– Сваіх кармоў дастаткова ці нешта дакупляеце?

– Травяністых кармоў дастаткова. Кожны год маем на паўтара года. Больш няма сэнсу трымаць, таму што ідзе пагаршэнне якасці. Ды і нарыхтоўваем каля 200 тысяч тон разнастайнай зялёнай масы, больш і не патрэбна. Бялковую сыравіну закупляем, працэнтаў 50–60, бо ў нас зона рызыкоўнага земляробства, рапс і іншыя культуры гэтага класа могуць вымярзаць. Але тым не менш мы і свайго бялку маем нямала. Як нідзе, відаць, па Беларусі расце соя, яе плошчы давялі да 600 гектараў. Ёсць свае бабы – 200 гектараў, лубін – таксама 200 гектараў. Уласны камбікормавы завод дазваляе мець таннейшыя (працэнтаў на 30 танней) высакаякасныя кармы.

Адразу тры вытворчасці працуюць над тым, каб якасныя кармы былі даступныя для жывёлы – у сэнсе лепш усваяльныя. І той жа камбікормавы завод, і цэх па вытворчасці экструдзіраванага корму (нагадвае кукурузныя палачкі, малыя цяляты спажываюць асабліва ахвотна). І цэх па перапрацоўцы алейных культур. Прывялі ў парадак свабодны будынак, паставілі абсталяванне і ціснем алей з усіх відаў алейных культур. Перш за ўсё з соі, атрымліваем соевы бялок. Перапрацоўка соі з далейшым экструдзіраваннем дае так званы эфект абароненага корму, арганізм жывёлы засвойвае яго зусім па-іншаму. Абсталяванне для гэтага каштуе 75 тысяч долараў. Не паверыце, завод сябе акупіў за два гады.

На чарзе цэх па вытворчасці травяністых сублімаваных кармоў – пусцім да лета, калі з'явіцца зялёная маса. Пачне працаваць на поўную магутнасць увесь гэты кармавы комплекс — ад закупкі збожжа адмовімся. Растлумачу: на гэты цэх я ўскладаю вялікія надзеі як на спосаб адысці ад жорсткай залежнасці ад збожжавага бялку. Заменім яго сублімаваным травяністым бялком, які для жывёлы больш прымальны.

Пабудаваныя гаспадаркай дарогі звязваюць паміж сабою самыя аддаленыя яе ўчасткі. На многія кіламетры працягнуліся гэтыя шляхі ўздоўж дагледжаных меліярацыйных каналаў, побач з палеткамі, праз вёскі. На будаўніцтве адной з новых дарог мы сфатаграфавалі кіроўцу МАЗа Алега ТРУША.

Працаўнікі ААТ «Парахонскае», чые імёны заносіліся на Дошку гонару прадпрыемства (па выніках работы за 2017 і 2018 гады):

ЖЫЛІНСКІ Мікалай Васільевіч, намеснік дырэктара па вытворчасці.
МЕЛЬНІК Валянціна Рыгораўна, аператар машыннага даення МТК № 1.
НАВУМОВІЧ Вера Іванаўна, аператар машыннага даення МТК № 2.
МАЛАЙЧУК Юлія Аляксандраўна, жывёлавод па доглядзе цялят.
ДАЎНАТОВІЧ Марына Георгіеўна, намеснік начальніка МТК № 2.
НАВАРЫЧ Мікалай Мацвеевіч, бетоншчык.
КРАВЕЦ Вячаслаў Мікалаевіч, начальнік вытворчага ўчастка.
ЕЎТУХ Ніна Мікалаеўна, повар.
КІРЫКОВІЧ Вячаслаў Мікалаевіч, кіроўца аўтамабіля.
ЛЫСЮК Аляксандр Віктаравіч, кіроўца аўтамабіля.
ПЕКУН Дзмітрый Мікалаевіч, трактарыст-машыніст.
СІДАРЭВІЧ Лілія Леанідаўна, бухгалтар.
ЖАРУН Марына Лявонцьеўна, галоўны эканаміст.
МІНЬКО Алішэр, начальнік МТК № 1.
ЧЭЧУН Кацярына Міхайлаўна, аператар машыннага даення МТК № 2.
ГРЫШКО Сяргей Дзмітрыевіч, жывёлавод КДіО аддзялення № 1.
ПАКАЛЮК Аляксандр Аляксандравіч, цясляр-бетоншчык.
РАМАНОВІЧ Марыя Захараўна, вагаўшчык.
СЛУЦКІ Ілья Рыгоравіч, інжынер-механік.
ЧЭЧУН Алена Фёдараўна, прадавец.
КАВАЛЕВІЧ Сяргей Міхайлавіч, кіроўца аўтамабіля.
ТРУШ Уладзімір Пятровіч, кіроўца аўтамабіля.
МАЛЫШЧЫЦКІ Алег Мікалаевіч, трактарыст-машыніст.
САШНЯНІН Уладзімір Уладзіміравіч, трактарыст-машыніст.
МАЦУКЕВІЧ Дзяніс Іванавіч, галоўны энергетык.

Імёны лепшых за 2019 год будуць названы ў сакавіку, пасля агульнага сходу акцыянераў, які пройдзе ў канцы лютага.

Тут размешчаны біягазавыя ўстаноўкі па вытворчасці ўласнай цеплавой і электраэнергіі.

Загадчык рамонтна-механічнай майстэрні № 2 Ігар ПАЛЕЙ аглядае новую ўборачную тэхніку, закупленую да чарговага сезона.

– Каторы раз да вас прыязджаем, Уладзімір Фёдаравіч, і пастаянна бачым адно – суцэльную новабудоўлю.

– Хочаш развівацца – будуйся, правіла простае. Таму трымаем уласную брыгаду будаўнікоў, якая налічвае 60 чалавек і «ўзброена» фактычна поўным наборам спецыяльнай тэхнікі і абсталявання. І я, і мае спецыялісты з самага пачатку будавалі для сябе. Было і так, што вечарам і ноччу мы са спецыялістамі вось за гэтым сталом малявалі сваё бачанне, а раніцай будаўнікі пачыналі ўзводзіць сцены. А следам за імі праекціроўшчыкі распрацоўвалі на паперы праект. Інакш не паспявалі. На той момант мы ўзялі найлепшыя ідэі з таго, што было ў Беларусі. Я цалкам абапіраюся ў рабоце на сваіх галоўных спецыялістаў, гэта сур'ёзныя людзі, дасведчаныя спецыялісты, кожны ў сваёй галіне, па-добраму амбіцыйныя. Узровень заработнай платы дазваляе ім мець сур'ёзны даход, і кожны працуе з поўнай аддачай, мяне гэта радуе.

Спецыялісты наогул падабраліся нармальныя. Стараемся іх належным чынам вучыць. Без перабольшвання можна сказаць, што за апошнія гады яны ўбачылі ўвесь свет. Не толькі Еўропу, але і Амерыку, і Канаду. І кожны раз прывозяць нешта новае. Шмат навінак тэхналогіі прывезлі з Галандыі і Ізраіля.

Сёлета зробім сабе падарунак да Дня Незалежнасці – пусцім новы комплекс, дзе будзе шмат тэхналагічных навінак, прывезеных спецыялістамі з замежных камандзіровак.

У прынцыпе, я 2019 годам задаволены, і ў будаўніцтве таксама, бо ўсё задуманае зрабілі. Ці амаль усё. Пакуль хіба не паспелі завяршыць сучасныя майстэрні для шыроказахопнай тэхнікі, каб і тут людзі маглі працаваць у цяпле і ўтульнасці. Тыя майстэрні, што ёсць, – яны таксама нармальныя, але шыроказахопнай тэхніцы цеснавата. А так у гаспадарцы ўсё ёсць, у тым ліку стацыянарная бензазапраўка, чатыры бензавозы, тэхніку запраўляем у полі.

Дырэктар ААТ «Парахонскае» Уладзімір ХРАЛЕНКА сярод будаўнікоў новага комплексу.

Кармы для вялікага статка ў гаспадарцы нарыхтоўваюць і захоўваюць па самых сучасных тэхналогіях. На гэтых фотаздымках вы бачыце камбікормавы завод, а таксама ўстаноўку для апрацоўкі алейных культур. За яе дзейнасцю назірае аператар Юрый ЗЕЛЬМАН.

Дарэчы, летась купілі новы бензавоз і тыя чатыры камбайны, пра якія я ўспамінаў, два малакавозы, два трактары, іншую тэхніку. Бяром яе пад наяўных людзей. Узяў тэхніку – яна павінна працаваць. Узяць і паставіць пад плот – няправільна.

– І ўсё ж – ці існуе дэфіцыт кадраў у паспяховай гаспадарцы, як некалі?

– Пакаленне, якое прыехала сюды ў 1975 годзе, цяпер штомесяц сыходзіць на пенсію. І мы штомесяц запрашаем на работу механізатараў. Я і сёння ўзяў бы чалавек 20 механізатараў, у тым ліку шафёраў, бо тэхнікі дабаўляецца і ўмелыя рабочыя рукі патрэбны.

Сёлета дае сябе адчуць і пэўны недахоп даярак, прычына – больш чым уважлівая: адразу 35 жанчын у дэкрэце. Дзякуючы такой іх актыўнасці дзетак у нас многа. Больш чым на дзве з паловай тысячы насельніцтва (калі дакладней, то 2767) на тэрыторыі сельсавета ў пачатку новага года налічвалася 540 дзяцей. На іх вельмі спадзяёмся. Падрастуць – падставяць плячо роднай гаспадарцы.

А пакуль сёння 50 прадстаўнікоў розных спецыяльнасцяў возім з горада, за 25 кіламетраў. Ёсць перавозкі і ўнутры гаспадаркі, за 16 кіламетраў, тых жа даярак – гэта ўжо спецыфіка буйнатаварнай вытворчасці: жывёлагадоўчыя комплексы размешчаны ў адным месцы, а вёскі могуць быць і ў іншым. Вы пыталіся пра ўмовы працы. Дык вось, рэжым работы даярак – праз дзень, плюс выхадны. У фермах — чысціня і парадак, выконваюцца патрабаванні санітарыі і гігіены, людзям дапамагае аўтаматыка. Стараемся падтрымліваць парадак паўсюдна, бо няма парадку – няма тэхналогіі.

– Ці лёгка вам сёння жывецца ў акружэнні трох рэк, на былых тарфяніках?

– Існуе пастаянная неабходнасць у працягу меліярацыйнага паляпшэння зямель і рамонце дзеючай сістэмы. Тарфянік пасля больш-менш працяглага выкарыстання паступова зношваецца. Тады ў засушлівыя перыяды пачынаюцца тарфяныя буры. Варта браць пад увагу і той факт, што меліярацыйныя збудаванні паступова старэюць, пачынаецца заіленне і сістэмы трэба пастаянна паднаўляць. Ёсць і такая з'ява, як зарастанне меліярацыйных каналаў. Таму давялося за сур'ёзныя грошы набыць галандскі агрэгат, які ачышчае каналы ад раслінасці. У сваю чаргу, два экскаватары падчышчаюць дно, дзе ёсць перашкода вадзе. Працуюць бульдозеры, касілкі. А ўвогуле падтрыманне меліярацыйнай сістэмы ў належным парадку патрабуе затрат. Мы жывём у такой зоне, дзе і засуха для нас – бяда, і залішняя вільгаць таксама. У маі мінулага года за адзін дзень выпала амаль месячная норма ападкаў. Гэта быў экзамен для сістэмы.

– Далейшыя перспектывы гаспадаркі вы звязваеце з развіццём тых галін, што ўжо ўмацаваліся, ці выношваеце нейкія новыя планы?

– Няма мяжы ў дасканаласці. Мы павінны дабіцца, каб былі стабільныя 1 кілаграм 200 грамаў – паўтара кілаграма прываг, і надоі тысяч дзевяць малака на карову. Тады, я лічу, гэта дазволіць бязбедна жыць і развівацца.

Пасля гутаркі Уладзімір Фёдаравіч, як і мінулыя разы, павёз журналістаў па гаспадарцы, паказаў новыя, заселеныя жывёлай карпусы і тыя, што яшчэ будуюцца. Звярнуў нашу ўвагу на новыя дарогі, пазнаёміў з людзьмі. І шчодра дзяліўся з намі планамі на блізкую і больш аддаленую перспектыву. Мы слухалі і абсалютна шчыра верылі, што ўсе гэтыя планы грунтуюцца на дакладным гаспадарчым разліку, веданні жыцця і на веры ў людзей, якія ўсе разам і ёсць адкрытае акцыянернае таварыства (зробім акцэнт на слове таварыства) «Парахонскае». А таму яны цалкам рэальныя.

«Гэты рэгіён павінен жыць і квітнець»

Размову пра сацыяльны пакет для парахонцаў, аб якім гаварыў дырэктар, мы працягваем са старшынёй прафсаюзнага камітэта Людмілай МАЛЫШЧЫЦКАЙ.

– У сацыяльны пакет таксама ўваходзіць матэрыяльная дапамога да адпачынку – палова ад сярэднемесячнай заработнай платы. Згодна з калектыўным дагаворам ёсць выплаты пры ўступленні ў шлюб упершыню, калі маладыя людзі адпрацавалі ў гаспадарцы не менш за год. Да 23 лютага робяцца выплаты мужчынам, да 8 сакавіка – жанчынам. І ўсім працаўнікам да прафесійнага свята. А яшчэ пры нараджэнні дзіцяці. І калі чалавек доўгі час хварэе (два месяцы і больш) альбо здараюцца сумныя падзеі, таксама аказваецца дапамога. Прычым у некаторых выпадках выплаты ідуць ад дырэкцыі і ад прафкама.

Пры выхадзе ветэрана працы на пенсію выплачваецца матэрыяльная дапамога ў залежнасці ад стажу працы ў гаспадарцы. Нядаўна дапоўнілі калектыўны дагавор цікавым пунктам, згодна з якім работнікам, што на момант дасягнення пенсійнага ўзросту адпрацавалі на нашым прадпрыемстве працяглы тэрмін – жанчыны 30, а мужчыны 35 гадоў – штомесячна будзе налічвацца пасля выхаду на пенсію матэрыяльная дапамога ў памеры трох базавых велічынь. Ёсць выплаты ў сувязі з 50-гадовым юбілеем.

Працуе камісія па аздараўленні. Пуцёўкі на курортна-санаторнае лячэнне дзецям нашых работнікаў бясплатныя. Калі гэта пуцёўка «Мама і дзіця», то дзіця едзе бясплатна, з мамы ўтрымліваецца 15 працэнтаў кошту пуцёўкі. Дарослыя адпачываюць за 30 працэнтаў кошту.

Аказваем дапамогу дзіцячаму садку, школе, у тым ліку школам і садкам далучаных да нас вёсак Камень і Пагост-Загародскі, музычнай школе, Дому культуры, царкве і іншым сацыяльным аб'ектам. Уладзімір Фёдаравіч нікому не адмаўляе, хто звяртаецца. Усе сацыяльныя аб'екты, што на нашай тэрыторыі, атрымліваюць ад гаспадаркі дапамогу. Гэты рэгіён павінен жыць і квітнець, лічыць дырэктар, і мы з ім згодны.

У тым ліку гаспадарка сур'ёзна падтрымлівае бальніцу. Там працуюць тры дактары, стаматолаг, штат медсясцёр. Ёсць стацыянар і паліклініка, аптэка. Нашы медыкі выконваюць усе працэдуры, як звычайна ў бальніцы. Даступнасць медыцынскай дапамогі – вось што галоўнае. Асабліва гэта дапамагае жыць нашым пенсіянерам.

На новай вуліцы гаспадаркі.

Пад зоркай паэта

– Радуе нас наша школа, – працягвае свой расказ Людміла Аляксандраўна. – Тут вучыцца 315 хлопчыкаў і дзяўчынак; педагогаў 40 чалавек, яшчэ 20 хоць лічацца абслугоўваючым персаналам, але ж, па сутнасці, – хіба не педагогі?

Школа ўдала выкарыстоўвае станоўчы ўплыў соцыуму на выхаванне і культурнае развіццё вучняў, актыўна супрацоўнічае з гаспадаркай, дзе працуюць бацькі. Вучацца дзеці нармальна, таму ўпэўнена адчуваюць сябе на раённых навукова-практычных канферэнцыях. Зусім нядаўна ў абласным цэнтры прайшоў міжнародны шматжанравы конкурс-фестываль «Белавежская зорка», і вучні прывезлі дыпломы лаўрэатаў 1-й ступені. Прывозяць узнагароды і з круглагадовых раённых спартакіяд устаноў адукацыі.

Слухаем Людмілу Аляксандраўну і думаем: а вось цікава, якімі атрымаюцца сачыненні надзвычай развітых і сапраўды таленавітых дзяцей мясцовай школы, калі ім здагадаюцца задаць тэму: «Што сказаў бы пра сучаснае Парахонскае Аляксандр Блок?» Шырока вядомы факт: паэт з сусветным імем бываў у Парахонску і яго ваколіцах падчас імперыялістычнай вайны, калі праходзіў службу ў інжынерных часцях. Меў у падначаленні дзве тысячы будаўнікоў і ўзводзіў фартыфікацыйныя збудаванні, а жыў у сядзібе мясцовага памешчыка князя І. Э. Друцкага-Любяцкога.

– Асобна варта падкрэсліць, што поспех школы ў пэўнай ступені закладваецца ў нашым дзіцячым садку. Чаргі ў яслі-сад няма, дзетак прымаем па першым звароце бацькоў. Дарэчы, у аграгарадку Парахонск захоўваецца стабільная нараджальнасць – 25–30 дзетак у год. У яслях-садку для адаптацыі навічкоў працуе група кароткачасовага знаходжання, якую самыя маленькія гадаванцы наведваюць разам з бацькамі. Яшчэ што цікава: у групах абсталяваны міні-агароды і міні-сядзібы, там дзеці атрымліваюць урокі эмацыянальных узаемаадносін з жывой прыродай, вучацца даглядаць расліны.

– Людміла Аляксандраўна, з мінулых разоў ведаем, што ў вас надзвычай паспяхова працуе і дзяржаўная дзіцячая школа мастацтваў.

– Так, я заўсёды з замілаваннем гляджу, як сюды спяшаюцца на заняткі сюды дзеці з футлярамі для музычных інструментаў за спінай. Адразу 125 дзетак авалодваюць навыкамі ігры на скрыпцы, баяне, акардэоне, на фартэпіяна і духавых музычных інструментах. У нас няма праблемы арганізаваць канцэрт на святы, бо выступаюць не толькі запрошаныя вядомыя артысты і выканаўцы, але і – вельмі ахвотна – нашы дзеці. І слухаюць іх не горш за праслаўленыя калектывы, а апладзіруюць мо яшчэ і лепш – свае ж таленты! Пра тое, што таленты, сведчыць такі факт: па выніках работы наша дзіцячая школа мастацтваў станавілася пераможцам раённага спаборніцтва сярод музычных школ у 2011, 2013, 2016, 2017 гадах. А ў 2018 годзе занесена на раённую Дошку гонару.

Узорны ансамбль народнай музыкі «Красачкі», які складаецца з вакальнай і аркестравай груп, удзельнічаў у Калядных песнапеннях у Рэспубліцы Польшча. Прывёз дыплом з міжнароднага фестывалю «Новыя вышыні». А яшчэ школа вырасціла Узорны духавы аркестр, які ў сваім рэпертуары налічвае, можаце сабе ўявіць, каля 60 твораў, — працягвае Людміла Малышчыцкая. – Ён дыпламант абласных свят духавой музыкі і рэспубліканскага конкурсу.

– Але ж парахонец без спорту – не парахонец...

– Святая праўда. Паспяхова працуе свая дзіцячаюнацкая спартыўная школа з аддзяленнямі футбола і лёгкай атлетыкі, тут актыўна займаецца 240 юнакоў і дзяўчат. З імі працуюць дзесяць трэнераў-выкладчыкаў, палове з якіх прысвоена другая кваліфікацыйная катэгорыя. Зборныя каманды школы даволі ўпэўнена адчуваюць сябе на абласных спаборніцтвах і спартакіядах, ёсць прыклады запрашэння яе членаў у нацыянальныя каманды Рэспублікі Беларусь і заключэння першых прафесійных кантрактаў.

Дадам, што на базе ДЮСШ працуе спартыўна-аздараўленчы лагер.

Край таленавітых людзей

– Наша грамадскае жыццё не было б такое поўнае і насычанае без Парахонскага сельскага цэнтра культуры. Мушу расказваць пра яго шматгранную дзейнасць крышку схематычна, інакш не хопіць ніякага месца, – працягвае прафсаюзны лідар. – Больш за 30 гадоў існуе пры сельскім цэнтры культуры ансамбль народнай песні «Маладзіцы», у якога за гэты час сабраўся сапраўдны музей дыпломаў і грамат, прывезеных з разнастайных мерапрыемстваў раённага і рэгіянальнага маштабу.

Вялікай папулярнасцю сярод працаўнікоў усёй Піншчыны карыстаецца вакальная група «Радуга», у скарбонцы яе дасягненняў ёсць і дыплом рэспубліканскага ўзроўню. А сёлета яны прынялі ўдзел у міжнародным конкурсе ў горадзе Астрог (Украіна).

Аператар біягазавай устаноўкі Ігар ЯСЮКОВІЧ.

Штогод харэаграфічны калектыў для дзяцей «Рытм» удала бярэ ўдзел у танцавальным конкурсе Litlle Starts, а харэаграфічны калектыў «Мажарэткі» тры гады запар упрыгожвае праграму Дня Незалежнасці ў пасёлку Лагішын.

Вельмі цікава працуе школа народнай творчасці, куды з задавальненнем прыходзяць дарослыя і дзеці. Яны не проста заняты вышыўкай, а па-мастацку вырабляюць разнастайныя кампазіцыі, упрыгажэнні, сувеніры з этнічнымі цікавінкамі. Некаторыя сталі экспанатамі свайго музея фальклору і быту, створанага дзякуючы намаганням нашых творчых работнікаў і бібліятэкі.

Аматарскія аб'яднанні ДК таксама заслугоўваюць добрага слова. Неаднойчы прымаў на сваіх цікавых святах гасцей з раёна клуб маладой сям'і. А ў клубе тэатральнай ігры «Крынічка» яго члены з задавальненнем дэманструюць немалыя акцёрскія здольнасці.

Я думаю, чытач паверыць мне на слова, што дзякуючы ўсім гэтым вельмі творчым людзям з іскрыстым характарам у нас за апошні час «на вышыні» прайшлі і Калядны фэст з маштабнай тэатралізацыяй, і Дзень абароны дзяцей з любімымі аніматарскімі персанажамі-фіксікамі, і купальскае прадстаўленне з масавым шэсцем да берага нашай ракі Бобрык, і свята аграгарадка з тэатралізаванымі выступленнямі, ды і шматлікія іншыя.

У заключэнне скажу зусім простую рэч: дзе яшчэ вясковы чалавек, якому з-за работы іншым разам і галавы не ўзняць, але не хочацца адставаць ад жыцця, можа палюбавацца на мультымедыйную ўстаноўку, зразумець, што такое аквагрым альбо навучыцца твісцінгу?.. Толькі ў сваім ДК. Невыпадкова наш вясковы цэнтр культуры заносіўся на Дошку гонару Пінскага раёна.

Царква Раства Багародзіцы ў Парахонску. Гаспадарка дапамагае прыхаджанам даглядаць гэты прыгожы старажытны храм. А побач эскіз капліцы ў Колбах, зроблены рукой Блока.

Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

УНП 290095025.

P. S. *Астэроіду 2540 астраномы далі імя Аляксандра Блока. У творчай групы «Звязды» прапанова: наступны астэроід, які будзе зафіксаваны навукоўцамі, назваць Парахонск. Мо калі два касмічныя сімвалы і сустрэнуцца.*

Бармен Валерыя САШНЯНІНА і работнік бара Святлана ВЕРХАВЕЦ рыхтуюцца сустракаць наведвальнікаў.

МОВА АНЛАЙН

У дыскусіі ўдзельнічалі Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ, доктар філалагічных навук, акадэмік, намеснік дырэктара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Ігар КАПЫЛОЎ, кандыдат філалагічных навук, дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, Мікалай ПРЫГОДЗІЧ, доктар філалагічных навук, загадчык кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта БДУ, Алена АНІСІМ, старшыня грамадскага аб'яднання «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны», Уладзімір КОШЧАНКА, загадчык сектара камп'ютарнай лінгвістыкі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, Юрась ГЕЦЭВІЧ, загадчык лабараторыі распазнавання і сінтэзу маўлення Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук, Аляксандр ШАСТАКОВІЧ, кіраўнік праекта «SAY.BY. Платформа падтрымкі жывой беларускай мовы», Алег КУНІЦКІ, дырэктар прыватнага прадпрыемства «Новы паварот».

АДНА МОВА — ДЗВЕ «ВІКІПЕДЫІ». А НАВІНЫ — ПА-РУСКУ...

«Звязда»: ***Тэму нашага круглага стала сумесна з Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа мы абазначылі як «Роля інфармацыйных тэхналогій у захаванні і папулярызацыі беларускай мовы». Слова «роля» тут узнікла невыпадкова — яна можа быць і станоўчай, і адмоўнай. Ці з'яўляецца на сённяшні дзень заўважная прысутнасць мовы ў віртуальнай прасторы сведчаннем таго, што мова жыццяздольная, калі ў жывой, непасрэднай камунікацыі яна ўжываецца не так часта? Датычна беларускай мовы, здаецца, пытанне можна ставіць менавіта так...***

Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ: Менавіта ў такім сваім гучанні тэма вельмі своечасовая і актуальная. Мы летась былі ў Якуцку на вельмі цікавай міжнароднай канферэнцыі «Захаванне моў народаў свету і развіццё моўнай разнастайнасці ў кіберпрасторы». У ёй удзельнічалі прадстаўнікі 63 краін з усіх кантынентаў. Асноўная ідэя гэтага надзвычай цікавага мерапрыемства — прысутнасць той ці іншай нацыянальнай мовы ў інтэрнэт-прасторы сёння становіцца галоўным фактарам яе захавання ў эпоху глабалізацыі і міжнароднай інтэграцыі... У даследаванні венгерскага лінгвіста Андраша Карная «Лічбавая смерць моў», апублікаваным некалькі гадоў назад, сказана пра тое, што толькі чатыры працэнты з усіх існуючых жывых моў у свеце прадстаўлены ў інтэрнэце. Гэтыя мовы ён дзеліць на тры групы: вельмі шырока прадстаўленыя, дастаткова шырока прадстаўленыя і вельмі мала прадстаўленыя. Беларуская мова, паводле Карная, адносіцца да другой групы. Гэта значыць, што беларускамоўнага кантэнту ў сеціве шмат і ён інтэнсіўна папаўняецца. Бо інтэрнэт-прастора — гэта не толькі афіцыйныя парталы, але і блогі, і сацыяльныя сеткі. Гэта добра, што беларускамоўныя матэрыялы разнапланавыя, і мова сацыяльных сетак жывая і запатрабаваная. Але кантэнт павінен папаўняцца не толькі стыхійна, але і мэтанакіравана, каб гэта былі змястоўныя, інфарматыўныя тэксты і матэрыялы.

Ігар КАПЫЛОЎ: Паводле Карная, рэальнае знікненне пагражае тым мовам, якія страчваюць сваю асноўную функцыю — камунікатыўную. Тут, калі гаварыць пра нашу мову, — праблема даволі сур'ёзная. Яшчэ адзін крытэрый — прэстыжнасць у маладога пакалення. Моладзь стала цікавіцца мовай больш, у тым ліку і дзякуючы віртуальнай прасторы, дзе па-беларуску можна свабодна камунікаваць і знаходзіць патрэбную інфармацыю... Яшчэ з крытэрыяў Карная — узровень прадстаўленасці ў інтэрнэт-прасторы і наяўнасць «Вікіпедыі» на нацыянальнай мове. У апошнім наша мова ледзь не напарадзе ва ўсіх — у нас ажно два варыянты «Вікіпедыі» — у афіцыйным правапісе і на «тарашкевіцы». У нас ёсць вялікі віртуальны кнігазбор «Беларуская палічка» (knigi.com), дзе прадстаўлены тысячы кніг — ад мастацкай літаратуры да вучэбных. Беларуская мова прадстаўлена і ў сацыяльных сетках. З аднаго боку, для развіцця мовы гэта добра — з'яўляюцца новыя словы, новы маладзёжны слэнг, з іншага — у гэтым асяроддзі няма ніякіх аўтарытэтаў, нярэдка напісанне наўмысна скажаецца, разбураюцца нормы правапісу і маўлення.

Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ: Ад таго, наколькі паўнавартасна беларуская мова будзе прадстаўлена ў кіберпрасторы — і ва ўнутрынацыянальнай, і ў сусветнай, — наколькі будзе забяспечана яе пашырэнне, будуць залежаць і адносіны да беларускай мовы ў іншай камунікатыўнай прасторы — у жывых зносінах паміж людзьмі. У нас многае ўпіраецца ў дзяржаўнае двухмоўе, і гаварыць трэба яшчэ і пра тое, каб беларуская мова была прадстаўлена ў інтэрнэце нароўні з рускай. У прыватнасці, усе афіцыйныя сайты павінны паралельна ствараць на абедзвюх дзяржаўных мовах. А гэта патрабуе пэўнай афіцыйнай падтрымкі, цэнтралізаванай і сістэмнай дзейнасці.

Юрась ГЕЦЭВІЧ: Афіцыйная падтрымка ўжо ў пэўным плане з'явілася. 23 кастрычніка 2017 года Саветам Міністраў была выдадзена пастанова № 797 «Аб унясенні змен і дапаўненняў у Палажэнне пра парадак функцыянавання інтэрнэт-сайтаў дзяржаўных органаў і арганізацый», якая ўнесла змены ў пастанову № 645 ад 29 красавіка 2010 года «Аб некаторых пытаннях інтэрнэт-сайтаў дзяржаўных органаў і арганізацый і прызнанні страціўшымі сілу пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 11 лютага 2006 г. № 192». Змены, унесеныя ў пастанову, цалкам уступілі ў сілу 1 студзеня 2019 года. Найбольш значным новаўвядзеннем з пункту гледжання перакладчыцкай дзейнасці названай пастановы з'яўляецца новы пункт 72, які сцвярджае, што «прымяненне рускай і беларускай моў з'яўляецца абавязковым пры размяшчэнні на інтэрнэт-сайтах інфармацыі, якая ўказаная ў падпунктах...». Мы яе разумеем так, што версіі вэб-сайтаў дзяржаўных установ павінны быць на дзвюх дзяржаўных мовах, прынамсі, асноўная інфармацыя на іх. У плане выканання гэтай пастановы назіраецца станоўчая тэндэнцыя, асабліва ў медыцынскай сферы. Да нас пачалі рэгулярна звяртацца з просьбай якасна перакласці, адаптаваць, лакалізаваць сайт той ці іншай установы.

Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ.

Ігар КАПЫЛОЎ.

Мікалай ПРЫГОДЗІЧ.

Уладзімір КОШЧАНКА.

Алена АНІСІМ.

Алег КУНІЦКІ.

Аляксандр ШАСТАКОВІЧ.

Юрась ГЕЦЭВІЧ.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Дадаткова зазначу, што гэтая пастанова, у сваю чаргу, яшчэ раз актуалізавала задачу адаптацыі інтэрнэт-сайтаў дзяржаўных арганізацый для інвалідаў па зроку (тая ж пастанова, пункт 3, абзац 4). Лабараторыяй распазнавання і сінтэзу маўлення АІПІ НАН Беларусі была распрацаваная пілотная версія сістэмы сінтэзу маўлення па тэксце для агучкі сайтаў для слабавідушчых, у тым ліку і на беларускай мове.

Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ: Гэта добра, але наўрад ці дастаткова. Магчыма, наспеў час для распрацоўкі і прыняцця дзяржаўнай праграмы па пашырэнні беларускай мовы ў кіберпрасторы, у развіццё Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі, дзе мова названа адным з найважнейшых фактараў гэтай бяспекі. Роля беларускай мовы зараз узрастае — яна атрыбут нашай дзяржаўнасці і суверэнітэту. У беларускамоўнай інфармацыйнай прасторы можна будаваць увесь кантэнт, падаваць інфармацыю з пазіцый менавіта нашай дзяржавы. А сёння нярэдка жыхар Беларусі першасна атрымлівае навіны з пазіцый дзяржавы іншай.

Мікалай ПРЫГОДЗІЧ: У нас пакуль не выпрацаваны механізм забеспячэння двухмоўя, у тым ліку і ў афіцыйнай, калі можна так сказаць, кіберпрасторы. У нас няма на гэты конт заканадаўчай ініцыятывы.

ДАКУМЕНТЫ — ЁСЦЬ, ЮРЫДЫЧНАЙ СІЛЫ — НЯМА

«Звязда»: ***Калі загаварылі пра заканадаўчую сферу... Прававая інфармацыя, у тым ліку і нарматыўныя акты, рознага кшталту юрыдычныя дакументы ў ІТ-дзяржаве павінны абавязкова быць у электроннай версіі ў адмысловай базе. Не сакрэт, што амаль усе законы, акрамя, бадай што, Кодэкса аб культуры, прымаліся ў адным варыянце — рускамоўным. Атрымліваецца, пераклад на беларускую, не зацверджаны на высокім узроўні, нават калі яго зрабіць, не мае юрыдычнай сілы...***

Юрась ГЕЦЭВІЧ: Атрымліваецца менавіта так. Калі дзяржаўная ўстанова хоча прадставіць на беларускай версіі свайго сайта вытрымкі з нейкага закона ці іншага нарматыўнага акта, узнікае пытанне: дзе яго ўзяць на беларускай мове не ў адвольным перакладзе, а ў афіцыйна зацверджаным, які мае юрыдычную сілу?

Алена АНІСІМ: І на практыцы для тых, хто хоча карыстацца з дзвюх дзяржаўных менавіта беларускай моваў, узнікаюць праблемы. Напрыклад, фірма Алега Куніцкага стварыла магчымасць здаваць на беларускай мове экзамен па Правілах дарожнага руху. Магчымасць у чалавека ёсць, але ўзаконенага права няма.

АЛЕГ КУНІЦКІ: Так, наша беларускамоўная праграма па тэставанні ведаў Правіл дарожнага руху даступная і для будучых кіроўцаў, і для аўташкол. Па водгуках ведаю, што людзі ёй карыстаюцца, нават у аўташколах у іх прымаюць экзамен па-беларуску без праблем. Калі ж справа даходзіць да экзамена ў ДАІ — скарыстацца беларускамоўнай праграмай не атрымліваецца. ДАІ не мае права выкарыстоўваць тэставыя заданні на беларускай мове і прымаць па іх экзамен. Экзамены ў ДАІ — мерапрыемства, па выніках якога выдаецца дакумент на права кіравання аўтамабілем, а Правілы дарожнага руху — нарматыўны акт, прымаўся ён па-рускі, і яго афіцыйнага перакладу на беларускую на сённяшні дзень няма.

Уладзімір КОШЧАНКА. Тое самае, дарэчы, і з Правіламі карыстання метрапалітэнам. Чаму яны ў вагонах не так даўно сталі рускамоўнымі? Яны былі прынятыя на беларускай мове ў 90-х, пасля Саўмін прыняў новую рэдакцыю толькі па-руску, і цяпер метрапалітэн, каб і хацеў, не мае ніякага права вешаць у вагонах беларускамоўную версію без афіцыйна зацверджанага перакладу...

Ігар КАПЫЛОЎ: Але гэта праблема ўжо пачала вырашацца. Пасля Вялікай размовы з Прэзідэнтам, калі кіраўнік дзяржавы падтрымаў ідэю перакладу заканадаўчых актаў на беларускую мову, Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі вельмі аператыўна адгукнуўся і пачалася канкрэтная работа. Была сфарміравана экспертная група, у якую ўвайшлі і мовазнаўцы, і юрысты, і журналісты. Выкананне гэтай работы даручылі Інстытуту мовазнаўства, на базе якога працуе Рэспубліканская тэрміналагічная камісія, супрацоўнікі якога маюць даволі вялікі вопыт. Падключыліся таксама вядучыя спецыялісты з мовазнаўчых кафедраў БДУ і БДПУ. Праца аказалася няпростай, хаця беларускамоўная юрыдычная тэрміналогія вельмі старажытная — фактычна бярэ пачатак з XIII стагоддзя, з выданняў грамат, а першы пісьмовы помнік («Судзебнік Казіміра») з'явіўся ў 1468 годзе. Але мы пры перакладзе дакументаў сутыкнуліся з пэўнымі цяжкасцямі, таму што тэрміны, якія выкарыстоўваюцца ў заканадаўстве, павінны быць аднастайнымі і сістэмнымі. Узніклі пытанні з сінонімамі: напрыклад, «результаты» і «итоги», «товарищество» и «общество» — было пытанне, у якім выпадку перакладаць «рэзультаты», у якім — «вынікі», «таварыства» ці «суполка». Калі б тэкст пісаўся адразу па-беларуску, праблем было б менш. А калі мы прывязаныя да рускага спецыфічнага тэксту, які ўжо мае статус закона, трэба рабіць усё вельмі асцярожна, вывяраючы кожнае слова. Тым не менш у нас ужо перакладзены, зацверджаны і змешчаны на сайце pravo.by Кодэкс аб шлюбе і сям'і, Выбарчы кодэкс, зараз працуем над перакладам Грамадзянскага кодэкса... Калі мы наладзім механізм перакладу і ўзгадненняў, ужо не будзе вялікай цяжкасцю прадстаўляць дэпутатам для разгляду і прыняцця законапраект на дзвюх дзяржаўных мовах адразу.

«ПРАБЛЕМА НА ТВАР»

«Звязда»: ***Усе прыведзеныя тут факты — і пра наша не апошняе месца паводле лінгвістычных даследаванняў, і пра стварэнне на мове заканадаўчай электроннай базы — гучаць аптымістычна. Але ці не бясспрэчны факт яшчэ і тое, што высокія тэхналогіі мову спрашчаюць, а то і псуюць. Парадокс: з аднаго боку прысутнасць мовы ў кіберпрасторы сведчыць аб яе жыццяздольнасці, з іншага — менавіта гэта прысутнасць ставіць саму мову пад пагрозу калі не знікнення, дык спрашчэння...***

Уладзімір КОШЧАНКА: Можна сказаць, што роля інфармацыйных тэхналогій, якія, здавалася б, палягчаюць задачу таго ж перакладу, у пэўным сэнсе катастрафічная. Сёння не знойдзеш ніводнай газеты, ніводнага сеткавага выдання, якія б не карысталіся інтэрнэт-перакладчыкам, прычым менавіта з рускай мовы на беларускую. Я займаюся Корпусам беларускай мовы, які, як і ва ўсім свеце, мусіць працаваць на перспектыву, і ў плане перспектывы я ўжо не маю крыніц, з якіх браць тэксты для гэтага Корпуса, акрамя твораў класічнай беларускай літаратуры, але гэта ўжо «ўчора», а не «сёння» і тым больш не «заўтра». А «сёння» тэкст, перакладзены з дапамогай праграмы, нават з самым шыкоўным рэдагаваннем, — гэта тэкст з нулявой вартасцю. Ён перадасць толькі інфармацыю, але не багацце мовы. Гэта машынны тэкст, які паўтарае рускі сінтаксіс, рускія выразы — «пьяный в стельку» перакладаецца як «п'яны ў вусціль», «проблема налицо» — «праблема на твар»... І многія думаюць, што так правільна! Людзі ўжо і гаварыць сталі, як перакладчык Google, і лічаць, што гэта нармальна.

Алена АНІСІМ: Але ж адмовіцца ад новых тэхналогій пры выкарыстанні беларускай мовы гэта не выйсце, таму што яны — вялікая палёгка для спецыялістаў у розных сферах. Напрыклад, я займалася перакладам з рускай мовы на беларускую кнігі «Ліцвіны ў арміі Напалеона». Нягледзячы на тое, што я прафесійны філолаг, я не стала набіраць пераклад уручную, а скарысталася перакладчыкам. Гэта і хутчэй, і даволі якасна, калі пасля дэталёва папрацаваць над перакладзеным тэкстам як рэдактар. І добра, што ёсць платформы, на якіх можна ажыццяўляць падобныя пераклады — гэта дапамога, гэта вельмі важны інструмент. І чым больш будзе такіх платформаў, у тым ліку і навучальных, на якіх можна будзе мову выкарыстоўваць і атрымліваць адказы на моўныя пытанні — тым будзе лепш для развіцця мовы. Нам трэба паглядзець уважліва на тыя лінгвістычныя платформы, якія існуюць для іншых моў (напрыклад, дыстанцыйнае вывучэнне мовы замежнікамі) і адаптаваць іх пад беларускую.

Мікалай ПРЫГОДЗІЧ: У нас кожная з мовазнаўчых кафедраў мае сваю пляцоўку ў інтэрнэце. Там столькі ўсякіх розных дапаможнікаў, у тым ліку і слоўнікаў, ніхто не забараняе імі карыстацца. Мы выкладваем у агульны доступ усе свае напрацоўкі, увесь час папаўняем сваю базу.

ПРА ЭНТУЗІЯСТАЎ, ЗАПАТРАБАВАНАСЦЬ І РЭКЛАМУ

Уладзімір КОШЧАНКА: Але наколькі запатрабаваная гэта і іншая база «людам пасапалітым» — вось у чым пытанне. Прывяду прыклад. Дзякуючы «Майкрасофту» мы зрабілі праграму праверкі арфаграфіі. Здавалася б, што яшчэ трэба — бярыце, карыстайцеся. Ёсць версія для Word, наступная версія будзе ўвогуле для Windows. Усе беларускамоўныя інфармацыйныя парталы адмовіліся, пісьменнікі не карыстаюцца, хоць яна бясплатна ляжыць у інтэрнэце і створана на падставе нарматыўных слоўнікаў. І што, патрэбен закон ці ўказ, які прымусіць карыстацца гэтым прадуктам, каб менш было памылак у тэкстах?

Юрась ГЕЦЭВІЧ: Мы нярэдка ў сваёй працы сутыкаемся з тым, што нашы арганізацыі не хочуць браць бясплатна ў агульным доступе, яны хочуць, каб зрабілі тое самае менавіта для іх за грошы... А што датычыцца праграмных прадуктаў, тут вельмі важнае слова «ўкараненне». Калі няма мастоў, у тым ліку, магчыма, і дакументальна аформленых, якія звяжуць паміж сабой распрацоўку і ўкараненне, толку будзе няшмат. Бо можна прыдумаць і напісаць на камп'ютарнай мове які заўгодна цікавы праект, але калі ён не будзе ўкаранёны, то ён не будзе шырока выкарыстоўвацца на практыцы...

Алена АНІСІМ: А можа, не хапае элементарнай рэкламы такіх прадуктаў. Чаму б не расказаць у інтэрнэце аб той жа праграме праверкі правапісу?

Уладзімір КОШЧАНКА: Якая яшчэ рэклама ў дадзеным выпадку патрэбна? Набраў у пошуку «праверка правапісу» — і вось табе спасылка на праграмы, бяры, карыстайся. Мы нават сустракаліся з настаўнікамі беларускай мовы, дэманстравалі ім сваю прадукцыю, але яна не выклікала ў іх цікавасці.

Мікалай ПРЫГОДЗІЧ: Бо настаўнікі, у прыватнасці, настаўнікі мовы, не прывучаны яшчэ да гэтага. Многія прывыклі верыць толькі падручніку на паперы. Студэнты — справа іншая. Яны з ахвотай шукаюць інфармацыю ў электронных крыніцах, у тым ліку беларускамоўных.

«Звязда»: ***У віртуальнай прасторы моладзь цікавіцца не толькі адукацыйнымі праектамі. Вось, напрыклад, на партале say.by можна знайсці ўстановы і арганізацыі, дзе з вамі будуць размаўляць па-беларуску...***

Аляксандр ШАСТАКОВІЧ: Мы, стварыўшы гэты сайт, рашылі паставіць высокія тэхналогіі на службу развіцця менавіта не віртуальнай, а жывой беларускай мовы ў непасрэднай міжасабовай камунікацыі. Ідэяй нашага праекта «Мова побач» было пазначыць на карце краіны месцы, куды можна прыйсці і размаўляць па-беларуску і без праблем атрымаць абслугоўванне на беларускай мове. А такіх месцаў не так і мала, праўда, адразу «ўгадаць» іх складана. З уласнага досведу скажу: калі ты звяртаешся да чалавека па-беларуску, даволі часта ён табе па-беларуску і адказвае. Калі ж ты гэтага не робіш — угадаць, што малазнаёмы суразмоўца добра валодае беларускай мовай, даволі складана. Мы збіраем на сваю інтэрактыўную карту ўсе прадпрыемствы і ўстановы, дзе гучыць беларуская мова. Натуральна, яе шмат у музеях, бібліятэках, іншых установах культуры. Але нярэдка яна сустракаецца і ў камерцыйных прадпрыемствах. Прычым тут здараецца па-рознаму: дзесьці на беларускай мове размаўляюць па ініцыятыве і з заахвочвання кіраўніцтва, дзесьці мова ідзе «з нізоў» — на ёй па ўласнай ахвоце размаўляюць самі супрацоўнікі. Канешне, у першым выпадку становішча прадпрыемства на нашай карце больш стабільнае. Калі ж на мове размаўляе толькі адзін супрацоўнік і ён звальняецца — гэта прадпрыемства з сайта даводзіцца прыбіраць. Зараз на нашай карце каля двухсот пазначаных пунктаў. Сайт карыстаецца папулярнасцю: мяркуючы па каментарыях, зацікаўленыя людзі наведваюць указаныя на ім месцы, пакідаюць пасля свае меркаванні. Нашы наведвальнікі — гэта ў асноўным моладзь, якая валодае сучаснымі тэхналогіямі.

З аўдыторыяй мы камунікуем у тым ліку і праз сацыяльныя сеткі. У нас таксама існуе мабільны дадатак — для сістэм Android і iOS. Спампаваўшы яго на смартфон, карыстальнік хутка можа знайсці беларускамоўны аб'ект паблізу ад свайго месцазнаходжання. Да таго ж у дадатку ёсць прафесійна агучаныя беларускамоўныя размоўнікі, якія дапамогуць не памыліцца ў падборы слоў і вымаўленні самому гаспадару мабільнай прылады. Мы іх рыхтавалі з дапамогай Інстытута мовазнаўства.

«Роля беларускай мовы зараз узрастае — яна атрыбут нашай дзяржаўнасці і суверэнітэту. У беларускамоўнай інфармацыйнай прасторы можна будаваць увесь кантэнт, падаваць інфармацыю з пазіцый менавіта нашай дзяржавы».

«Звязда»: ***Дык, можа, стварыць падобныя дадаткі з размоўнікамі на ўсе выпадкі жыцця? Кшталту «Гавары правільна» або «Пішы правільна». Спампаваў такі дадатак і, калі засумняваўся наконт нейкага слова ці выразу, — адкрыў дадатак, падгледзеў...***

Уладзімір КОШЧАНКА: Хацелася б сказаць, што такі дадатак абавязкова стане запатрабаваным, але... Зараз у беларускамоўным асяроддзі існуе такая, на жаль, папулярная думка: маўляў, давайце спачатку пачнём гаварыць на мове, а пасля ўжо будзем вучыцца гаварыць правільна... Калі стварацца падобныя дадаткі — узнікне да таго ж пытанне іх легітымнасці. Як існуе дзве беларускія «Вікіпедыі», так у беларускамоўным асяроддзі існуе некалькі версій «правільнай мовы», і кожны лічыць, што рацыю мае менавіта ён. І не ўсе, калі надумаюць стварыць падобны дадатак, пойдуць па кансультацыю ў наш Інстытут...

Ігар КАПЫЛОЎ: Мы ж самі можам распрацаваць якія заўгодна даведнікі — матэрыялу і спецыялістаў хапае. А далей — патрэбна падтрымка менавіта ад ІТ-сферы: ад напісання праграмы да ўкаранення. Пакуль, на жаль, асаблівай падтрымкі менавіта ў гэтым пытанні мы не маем. Прынамсі, выходзілі з падобнай прапановай на аднаго з мабільных аператараў, але наша ідэя так і не атрымала водгуку...

Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ: Каб мова захавала сваю паўнавартаснасць у кіберпрасторы, адным ці двума мабільнымі дадаткамі не абыдзешся. Патрэбна наяўнасць дастатковай дабраякаснай лінгвістычнай базы і яе поўная прэзентацыя — у інтэрнэце павінны прысутнічаць у свабодным доступе асноўныя слоўнікі, граматыкі, спецыяльныя даведнікі. Таксама павінны стварацца і ўдасканальвацца дапаможныя праграмы. І яшчэ вельмі важна, каб у інтэрнэт-прасторы было як мага шырэй прадстаўлена нацыянальна-культурнае беларускамоўнае поле — ад літаратурных твораў, помнікаў беларускага пісьменства да гістарычных нарысаў. Яшчэ вельмі важная дзяржаўная падтрымка энтузіястаў у гэтай сферы, бо многае пакуль што трымаецца менавіта на іх.

Круглы стол правяла Алена ЛЯЎКОВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Спытайце пра радзіннае

Што рабілі на Масленіцу са старымі халасцякамі?

Пытанне настаўніцы Марыны Н. з Мінска: «Штогод бываем на гарадскіх святкаваннях Масленіцы. Аднойчы ўдалося ўбачыць абрад «Калодкі», мяркуючы па выкананні, вельмі старажытны. Што ён абазначае?»

Сярод некаторых даследчыкаў славянскай традыцыйнай культуры існуе меркаванне, што Масленіца перш за ўсё лічылася святам «наважонаў» — моладзі, якая стварыла сям'ю ў прамежку часу паміж леташнім Вялікаднем і толькі што завершаным Мясаедам. Найбольшая колькаць вяселляў сярод усходнеславянскіх народаў спраўлялася восенню і ў зімовы Мясаед. Масленіца падводзіла рысу перыяду правядзення сямейных урачыстасцяў і, уласна кажучы, спыняла іх напярэдадні Вялікага посту. Пільная ўвага да становішча соцыуму і рэгуляванне шлюбных адносін паміж яго членамі тлумачылася тым, што, у адпаведнасці са старажытнымі ўяўленнямі нашых продкаў, працяг чалавечага роду самым непасрэдным чынам уплываў і на ўрадлівасць глебы, і на ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур. Інакш кажучы: чым больш сямейных пар справіць вяселле, тым большы плён магла чакаць вясковая абшчына ў новым годзе.

Кожны гаспадар разумеў: калі сын дасягнуў адпаведнага ўзросту, ён павінен ажаніцца, стварыць сям'ю і выканаць абавязак, прадугледжаны прыродай і Творцам. Чалавек прыйшоў у гэты свет, каб аднавіць ланцужок жыцця на новым этапе родавай эстафеты.

Жанчыны, якія рабілі абходы хат на Масленіцу, абавязкова наведвалі тых гаспадароў, у якіх гадаваліся хлопцы-пераросткі, і прывязвалі да нагі «жаніха» невялікую драўляную калодку. Найбольш архаічнае яе значэнне зводзілася да актуалізацыі эратычнай сімволікі: «калодка» (палка, шостка). У больш познія часы ролю гэтага абрадавага атрыбута выконвалі розныя прадметы: кавалак чырвонага паса, стужка, смаліна, салёная сялёдка, лялькі драўляныя або выкрабленыя з тканіны, абаранкі, аздобленыя рознакаляровымі стужкамі або кветкамі, хусціна або звычайны бурак. «Калодку» чаплялі хлопцам да нагі, павязвалі на шыю, прышпільвалі да адзежы ніжэй спіны. Усё гэта азначала адно: тэрмінова трэба жаніцца.

Знак абрадавага пакарання хлопцы-пераросткі павінны былі насіць увесь масленічны тыдзень. Аднак калі хлопец лічыў пакаранне неапраўданым, ён мог «адкупіцца» ад сваіх аднавяскоўцаў падарункам або пачастункам.

Свавольны гурт жанчын рухаўся па вуліцы са спевамі, фрывольнымі прыпеўкамі. Як толькі дарогай ім пападаўся нежанаты хлопец, яны тут жа накідвалі яму на шыю вяроўку і прымушалі валачы па вуліцы палена.

Цікава, але ў некаторых мясцінах «калодку» ў выглядзе калыскі, выкрабленай з дрэва або выразанай з бульбіны ці бурака, вешалі на шыю фарсістым дзяўчатам, якія «доўга перабіралі» хлопцаў і ў выніку засталіся без пары.

Аднак у пазнейшы гістарычны час, відаць, недзе ў канцы XIX стагоддзя, абрад калодкі быў трансфармаваны і набыў гульнёвы характар. На вячорках, дзе збіралася вясковая моладзь, «калодка» ў выглядзе чырвонай стужкі была ўжо не столькі сімвалам рытуальнага пакарання, колькі знакам звычайных юнацкіх заляцанняў. Хлопцы чаплялі чырвоны бант каханай дзяўчыне на спіну, а тая павінна была здагадацца, хто гэта зрабіў.

Этнографы мінулага адзначалі некаторыя асаблівасці выканання абраду «калодкі» на Міншчыне. Абрубак дрэва, як правіла, тут цягалі толькі хлопцы, перапранутыя ў старое адзенне, у суправаджэнні гурта дзяцей, а твар закрывалі маскамі жывёл. Шумная, звонкагалосая кампанія абавязкова спынялася пад вокнамі той хаты, у якой жыла дзяўчына ў гадах. Дзеці пачыналі гучна крычаць, каб тая выйшла на вуліцу, а хлопцы тут жа патрабавалі ад яе выкуп. Дзяўчына запрашала хлопцаў зайсці ў хату, каб пачаставацца. Пасля гэтага гуллівая кампанія рушыла далей.

На поўначы Міншчыны абрад «цягання калодкі» меў прынцыпова іншы кірунак. Аб'ектам масленічных абходаў былі толькі тыя сем'і, дзе была дзяўчына, якая толькі што выйшла замуж. У такім разе сімволіка рытуальнага дзеяння была заклікана паспрыяць хуткай цяжарнасці і перасцерагчы маладую жонку ад негатыўных уздзеянняў на ўвесь яе перыяд.

Такім чынам, штогадовае рэгуляванне адносін у межах вясковай абшчыны, якое выконвалі на масленічным тыдні, мела двухбаковую накіраванасць. З аднаго боку, людзі выказвалі падзяку за разуменне неабходнасці своечасовага ўключэння ў склад захавальнікаў і прадаўжальнікаў роду, з другога — той, хто з нейкіх прычын на момант выканання абрадавай дзеі не абраў шлюб, падвяргаўся публічнаму пакаранню, зразумела, не фізічнаму, а жартоўна-сімвалічнаму, але ад гэтага не менш выніковаму.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый ды абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Скажыце, доктар...

ЧУЖЫ СЯРОД СВАІХ

Чаму ў падлеткаў узнікаюць праблемы ў камунікацыі?

Адна з асноўных патрэб у пераходным узросце — будаванне сацыяльных стасункаў. Гэта значыць, падлетку важна адчуць сябе ў «зграі», сярод роўных, і кантактаваць з аднагодкамі. Але часам здараецца так, што дзеці не маюць сяброў, не жадаюць ніякіх кантактаў і ўвогуле не хочуць выходзіць са свайго пакоя. Як распазнаць праблемы ў камунікацыі і перамагчы іх, расказалі спецыялісты цэнтра, сяброўскага да падлеткаў, «Давер» — псіхолаг-кансультант Святлана ПАЛЯШЧУК і каардынатар Валянціна ШУКАН.

— У падлеткавым узросце вельмі важна кантактаваць з равеснікамі, і псіхолагі кажуць, што гэта неад'емны складнік развіцця. А што рабіць, калі адбываецца наадварот — падлетак замыкаецца ў сабе і не жадае ні з кім мець стасункаў? Чым гэта можна растлумачыць?

С. П. — Сапраўды такое здараецца. І бацькі пачынаюць задаваць пытанні: ці ўсё добра з падлеткам, бо ён нікуды не ходзіць, у яго няма сяброў, ён ні з кім не хоча кантактаваць, нават на дзень нараджэння няма каго запрасіць. Прыблізны ўзрост такіх падлеткаў (найчасцей гэта дзяўчаты) — 12-14 гадоў. Пры гэтым дзіця сцвярджае, што яму так добра. Работа з такім падлеткам пачынаецца з таго, што мы высвятляем, ці сапраўды яму камфортна. За гэтым «добра» можа хавацца псіхалагічная траўма, атрыманая ў выніку кантактавання. І можа аказацца, што такое дзіця — ізгой у класе, той, з кім з нейкіх прычын не хочуць мець зносін, і ён проста звыкся з гэтай сітуацыяй. І «мне так добра» азначае «няма іншага выйсця». Тады мы працуем у адным кірунку.

Другая група — сарамлівыя падлеткі, якія не маюць камунікатыўных навыкаў і не ўмеюць устанаўліваць кантакты з равеснікамі. У іх, як правіла, жорсткія інтымныя межы, яны скардзяцца на павышаную трывожнасць: у мяне пацеюць рукі, мне страшна апынуцца ў новай кампаніі, я не ведаю, пра што гаварыць, я ўвесь час маўчу. Тут размова ідзе пра неабходнасць развіваць камунікатыўныя навыкі. Пры правільнай рабоце з такіх дзяцей потым атрымліваюцца нават лідары.

Трэцяя група дзяцей — тыя, каму ў такім стане сапраўды добра. У іх нізкая патрэба ў камунікацыях. Яны жывуць сваім унутраным светам і перажываннямі. Як правіла, гэта дзеці, якія шмат чытаюць, часта яны захапляюцца фантастыкай. І насычэнне камунікатыўнай патрэбы адбываецца за кошт кантактавання з віртуальным героем. У мяне на кансультацыі нядаўна быў 11-гадовы хлопчык. Ён актыўна вывучае мовы, цяпер вось захапіўся кітайскай. Кантактаванне з равеснікамі ў яго мінімальнае. Увогуле хлопчыкі больш арыентаваны на задачу, а не на камунікацыю.

Трэба сказаць, што сёння сацыялізацыя ў падлеткаў адбываецца крыху не так, як у старэйшага пакалення. Яна перамясцілася ў інтэрнэт-прастору, у сацыяльныя сеткі — дзеці кантактуюць там. Яны не выходзяць на вуліцу, не гуляюць у футбол, як раней. Калі мы вядзём размову пра сярэднестатыстычнага гарадскога падлетка з нармальнай сям'і, то ён у сацсетках стварае суполкі, там знаёміцца, гуляе, кантактуе. Не ўсе бацькі гэта разумеюць і часам імкнуцца адабраць гаджэт, выпіхнуць дзіця на вуліцу, дзе нікога з равеснікаў няма. Часам гэта і метад пакарання — адняць гаджэт, адключыць інтэрнэт і стварыць дзіцяці ізаляцыю. Так рабіць нельга. Вы садзейнічаеце таму, што ў падлетка вырасце дэпрэсіўны фон, ствараеце стрэсавую сітуацыю.

— Як бацькам вызначыць, ці ёсць у падлетка праблемы ў камунікацыі?

С. П. — Знайсці чалавека з поўнай адсутнасцю праблем у гэтай сферы даволі цяжка. Іншая справа, што ўсе яны вырашальныя. Калі ж размова ідзе пра тое, каб вызначыць, ці не ізаляванае дзіця, то тут перш за ўсё бацькам варта паназіраць за ім. Дастаткова задаць простыя пытанні: з кім ты сядзіш за партай у класе, з кім ты сёння кантактаваў. 70 % часу дзіця праводзіць у школе — там можа не быць сяброў, але павінны быць таварышы. Што можа насцярожыць бацькоў? Калі, напрыклад, дзіця пэўны час хварэе і яму няма каму патэлефанаваць (ці яно баіцца), каб спытаць хатнія заданні. Гэта трывожны сігнал. Калі ж яно ведае, у каго можна спісаць хатняе заданне ці спытаць, што задавалі, гэта нармальнае дзіця з адсутнасцю істотных праблем у камунікацыі.

Што датычыцца сяброўскіх адносін, то гэта больш складанае пытанне. У сучаснага падлетка яны не так проста складваюцца, як у нас. Сяброўства — доўгатэрміновыя адносіны, якія патрабуюць 3-5 гадоў. Сёння бацькі — прадзюсары ўласных дзяцей. Развіваюць іх з 3-5 гадоў — водзяць па гуртках, спартыўных секцыях, музычных студыях. І ў дзяцей не паспяваюць сфарміравацца сяброўскія адносіны, бо ўсе спрабуюць розныя заняткі, надоўга ў адным месцы мала хто затрымліваецца. Бацькам у першую чаргу важна, каб дзіця развівала свае здольнасці. А сацыяльныя кантакты — па рэшткавым прынцыпе. Таму ў дзяцей няма вопыту доўгатэрміновых адносін. Магчыма, у далейшым гэта адаб'ецца і на сям'і, калі такія людзі не будуць гатовы жыць у шлюбе да старасці: пакантактавалі і разышліся.

Да таго ж сучасныя дзеці выхоўваюцца як індывідуальнасці. Калі старэйшае пакаленне было арыентавана штосьці разам будаваць, то сучаснае — яркая выражаныя індывідуалісты. Калі яны збіраюцца разам, гэта даволі высокаканкурэнтнае асяроддзе, таму здружыць іх — складаная задача нават для вопытнага педагога. На першым месцы ў падлеткаў сёння сям'я (калі яна паспяховая) і меркаванне бацькоў, на другім — інтэрнэт, дзе можна знайсці адказ на любое пытанне, і на трэцім — значны даросла па-за сям'ёй. Гэта можа быць педагог, трэнер, старэйшы сябар, да якога можна звярнуцца па параду. І на самым апошнім месцы — равеснікі.

— Калі бацькі бачаць, што з кантактаваннем ёсць праблемы, як дапамагчы дзіцяці?

С. П. — Калі праблемы звязаны са школьнай адаптацыяй, у школе ёсць псіхолагі, і да іх варта звяртацца. Такі спецыяліст мае пэўны інструментарый, каб вызначыць статус дзіцяці ў калектыве, паглядзець, каму аддаюць перавагу, а хто ізаляваны, хто мог бы пасябраваць з такім хлопцам ці дзяўчынай. Ён можа даць рэкамендацыі класнаму кіраўніку, бацькам.

Калі размова ідзе пра нейкую камунікатыўную траўму, то можна пайсці на індывідуальную кансультацыю да псіхолага і прапрацаваць гэту праблему. Калі размова ідзе пра адсутнасць камунікатыўных навыкаў, то яны набываюцца і развіваюцца выключна ў групе.

В. Ш. — Пры нашым цэнтры існуюць валанцёрскі клуб і клуб ЮНЭСКА. І ў маладых людзей, якія дапамагаюць нам у якасці валанцёраў, ёсць навыкі сумеснай дзейнасці і сацыялізацыі. Падлеткі, якія наведваюць клуб на працягу года, істотна мяняюцца. Прыйшлі з парушэннем камунікацыі, а цяпер гэта зусім іншыя людзі. Спачатку яны баяліся нават пераступіць парог. Затое потым, калі ўзнікаюць псіхалагічныя ці медыцынскія праблемы, трывожнасць наконт службы ў войску, паступлення, здачы экзаменаў, яны маюць магчымасць абмяркоўваць гэта з нашымі спецыялістамі, якіх ужо ведаюць. Спецыялісты цэнтра, дарэчы, выступаюць для іх у ролі значных дарослых.

С. П. — Добрая форма для развіцця камунікацыі — форма адукацыйных лагераў падчас школьных канікул. Напрыклад, з мэтай падцягнуць англійскую, але там добра развіваюцца і камунікатыўныя навыкі. Сёння не ўсе бацькі адпусцяць дзіця ў летні лагер на тры тыдні. Таму форма адукацыйных лагераў — пэўны кампраміс. Днём дзіця ў лагеры, увечары вяртаецца да бацькоў.

«Трэба сказаць, што сёння сацыялізацыя ў падлеткаў адбываецца крыху не так, як у старэйшага пакалення. Яна перамясцілася ў інтэрнэт-прастору, у сацыяльныя сеткі — дзеці кантактуюць там».

— Калі не вырашаць праблемы ў камунікацыі, яны могуць самі прайсці з узростам?

С. П. — Тут складана прагназаваць. Гэта не прастуда, якая праходзіць сама. Калі чалавек не мае камунікатыўных навыкаў, то яму няма чым карыстацца. Магчыма, такі чалавек неяк і выплыве, а магчыма, патоне. Цалкам імаверна, што ён прыйдзе на работу, там будзе вельмі прыязны калектыў і навыкі разаўюцца. А магчыма, і не, і месца працы давядзецца мяняць.

— А калі такі чалавек выбера прафесію, звязаную з пастаянным кантактаваннем?

С. П. — Часам прафесія можа спрыяць развіццю пэўных навыкаў. Але калі пры нізкім камунікатыўным паказчыку малады чалавек выбірае прафесію ў сферы «чалавек — чалавек», гэта будзе выклікаць моцнае эмацыянальнае выгаранне. Прыходзячы дадому, ён будзе адчуваць сябе абясточаным. І яму ўсё ж лепш выбіраць занятак па прынцыпе «чалавек — тэхніка». Гэта важна ўлічваць. Да таго ж трэба памятаць, што развіваць камунікатыўныя навыкі пажадана да пэўнага ўзросту — 25-30 гадоў. Пасля 30 псіхіка становіцца рыгідная, у нас ужо сфарміравана светапоглядная пляцоўка, і нам складана мяняцца.

Святы

«ЛЮДЗІ ВЫВУЧАЮЦЬ НАШУ МОВУ, А Я ШТО — НЕ МАГУ ЯЕ ЎСПОМНІЦЬ?»

Пасля вайны наша, на жаль, няпоўная сям'я (тата загінуў на фронце, а маленькая сястрычка памерла ў бежанцах) вярнулася ў родны дашчэнту разбураны Віцебск, пасялілася ў цесным пакойчыку барака. З часам мама ўладкавалася на работу, я стала хадзіць у школу, а на ўсё лета (ніякіх піянерскіх лагераў яшчэ не было) ездзіць да бабулі Каці ў вёску Града. Там усе размаўлялі па-беларуску, а як спявалі...

У лузе, за нашай хаткай, пад старой самотнай вярбой была вялікая сажалка. Мы з бабуляй там пралі бялізну. І тады над усёй ваколіцай плыў прыгожы бабулін голас: «А ў полі вярба, пад вярбой вада. Там хадзіла, там гуляла дзеўка малада».

Я думала, што гэта ж я, тая дзеўка! І гэта мне хадзіць і гуляць тут заўсёды.

Чалавек мяркуе, а бог размяркоўвае: вярнуўся з вайны мой дзядзька (родны брат таты), уладкаваўся на работу ў Кіеве і забраў маю бабулю да сябе. Як жа я тады гаравала! Помню, на вуліцы кідалася ледзь не да кожнай хоць нечым падобнай жанчыны і потым, расчараваная, адступала: «Гэта не бабуля... Не яна... Не мая...»

У школе, дзе я вучылася, была добрая бібліятэка. Я з захапленнем чытала там «Міколку-паравоза» Міхася Лынькова, «Люсю-дарагусю» Кузьмы Чорнага, «У краіне райскай птушкі» і «Чалавек ідзе» Янкі Маўра... А былі ж яшчэ Янка Купала, Якуб Колас... Усіх любімых пісьменнікаў, якія размаўлялі са мной на роднай мове, назваць немагчыма!

Але ж пасля школы я паступіла ў педінстытут, дзе ўсе прадметы выкладаліся па-руску, дзе зноў жа па-руску ўсе размаўлялі, і, як многія, як амаль усе, стала жыць паводле прымаўкі: «Як улез у вараны, то і кракай, як яны». Рускамоўных студэнтаў была пераважная большасць нават у літаратурным аб'яднанні, куды я адразу ж стала хадзіць.

...Працуючы ў Глыбоцкай школе № 3, я з цікавасцю і шчырай павагай ставілася да нашых беларускіх моваведаў, да (светлай памяці!) дырэктара школы Віталя Рыгоравіча Гарановіча, які па-беларуску пісаў вершы, друкаваўся ў нашай раённай газеце. Былі і ёсць там іншыя аўтары — Ганна Зінкевіч, Алег Салтук, Марыя Баравік, Уладзімір Савуліч, Алесь Жыгуноў...

Я ж асабіста вельмі доўга і думала, і пісала па-руску, пакуль аднойчы не спытала сябе: «А чаму? Я што — не беларуска? Людзі — нават замежнікі — вывучаюць нашу мову з нуля, а я, выходзіць, не магу яе ўспомніць?»

Вось так, паступова, пад уплывам журналістаў з нашай раёнкі, «Звязды», часопіса «Вожык» я вярнулася да беларускай: з радасцю чытаю на ёй, пішу, не магу пакуль пахваліцца тым, што добра ведаю, але ж словы да мяне аднекуль прыходзяць...

Можа, ад той вярбы, дзе мы з бабуляй пралі бялізну?

Зоя Наваенка,
г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.

Ведай нашых!

ШКОЛА, ДЗЕ РЫХТУЮЦЬ ЧЭМПІЁНАЎ

...У двухпавярховы будынак, што ў цэнтры нашага мястэчка Разанцы, кожную раніцу сцякаюцца гаманкія ручайкі. Гэта дзеці з'язджаюцца ў школу, у дом, дзе кожнага любяць, паважаюць і цэняць, дзе вучаць быць шчаслівымі і паспяховымі, дзе настаўнікі, вучні, бацькі захоплены агульнымі ідэямі і марамі.

Стварыць падобную атмасферу па сілах, вядома ж, не кожнаму.

Мне пашчасціла працаваць у калектыве, якім кіруе малады дырэктар Арцём Валер'евіч Барташэвіч. Гляджу на яго і часам не разумею, як ён паспявае праводзіць урокі і штодзённыя секцыі, пасяджэнні, педсаветы, рыхтаваць дзяцей да ўдзелу ў спартыўных спаборніцтвах, кожнага выслухоўваць і нешта раіць, а галоўнае — заўсёды быць добразычлівым, адкрытым да зносін...

Наколькі ведаю, пытанне аб выбары прафесіі перад нашым Арцёмам Валер'евічам не стаяла. Ён, як расказваў, змалку хадзіў у спартыўную залу — глядзеў, як праводзіць заняткі ягоны бацька, хацеў стаць падобным.

А таму пасля школы паступіў у педуніверсітэт, дзе вучылі, дарэчы, не толькі думаць і карпатліва працаваць, але і разумець дзяцей, у кожным бачыць асобу.

Пасля размеркавання студэнт Барташэвіч трапіў у родны Мсціслаўскі раён. З 2010 года ён выкладае тут фізічную культуру і здароўе, вядзе секцыі і штодзённыя трэніроўкі з вучнямі, якія, што важна, бачаць у маладым настаўніку яшчэ і сябра. Дасканала валодаючы сваім прадметам, Арцём Валер'евіч выхоўвае ў дзецях павагу і любоў да спорту, да здаровага ладу жыцця. У выніку наша гандбольная каманда ўжо пяць гадоў запар перамагае ў спаборніцтвах розных узроўняў. Нават на рэспубліканскіх ужо добра ведаюць, што на Мсціслаўшчыне ў аграгарадку Разанцы ёсць школа, дзе 80 працэнтаў вучняў займаецца ў розных спартыўных секцыях, дзе рыхтуюць будучых чэмпіёнаў пад заклікам «Пакуль мы разам — мы непераможныя!»

...За 10 гадоў плённай працы нашаму дырэктару не раз прысвойвалі званні «Найлепшы па прафесіі», «Чалавек года». І на пытанне аб сакрэтах поспеху ён адказваў тады, што ў рабоце яму вельмі дапамагае дэмакратычны стыль кіравання, давер калег і, вядома ж, любоў да дзяцей, да справы. «Мая школа, — кажа Арцём Валер'евіч, — гэта мая сям'я, якую нельга не любіць, з якой нельга не перамагаць і не адольваць цяжкасці».

Тамара Ерасценка,
настаўніца беларускай мовы і літаратуры,
Мсціслаўскі раён.

Свой погляд

СЛАВУТЫЯ БОЛЬШ НЕ СЛАВУТЫЯ?

Здаўна купляю ў кнігарнях адрыўны каляндар «Родны край» — выданне, багатае на звесткі пра юбілейныя даты, пра культурныя і грамадскія падзеі. Часам, праўда, з прыкрымі памылкамі... Але ж гэта, думала, у ранейшыя гады.

На вялікі жаль, не парадаваў каляндар і сёлета. Не буду засяроджваць увагу на адсутнасці ў ім звестак пра музыкантаў і мастакоў: гэта, як той казаў, не мая парафія. Але пісьменнікі... Ні згадкі ў выданні пра 100-годдзе з дня нараджэння Андрэя Макаёнка, Алеся Астапенкі, Пятра Прыходзькі, Аркадзя Марціновіча, Аляксея Карпюка... Ні слова пра 180-годдзе — Альгерда Абуховіча, Францішка Багушэвіча, 130-годдзе — Вінцука Адважнага, Казіміра Сваяка, 110-годдзе — Ларысы Геніюш, юбілеі Броўкі, Глебкі, Скрыгана...

Спіс можа быць вельмі вялікі. І гэта пры тым, што сёлетні 2020-ы зноў праходзіць пад знакам Года малой радзімы, і таму ў выданні, як пазначана ва ўступным слове, абяцалася шмат цікавай інфармацыі пра нашы гарады, вёскі, рэкі, азёры, «а таксама пра славутых людзей Беларусі». У іх шэрагі з пісьменнікаў трапілі хіба народныя Іван Навуменка і Рыгор Барадулін, а таксама Уладзімір Караткевіч, Аляксей Дудараў, Таіса Бондар, Алесь Пальчэўскі, Аляксей Коршак.

Затое ў календары пазначаны амаль усе сусветныя святы: дзень пацалунка, смеху, аўтарскага права, ювеліра, падтрымкі ахвяр злачынстваў... Патрэбныя звесткі? Магчыма, але ж каляндар мае назву «Родны край». Дык чаму інфармацыя пра яго павінна быць мінімальная?

Думаю, што гэта пытанне цікавіць не толькі мяне.

А. У. Шамякіна,
г. Мінск.

Была вайна

«Мая вёска перажыла страх і голад, але адрадзілася»

...Лістапад 1943-га. Нашу вёску Пятровічы, тады Парыцкага раёна, адбілі ў ворага, мы сустракалі вызваліцеляў, крычалі: «Нашы прыйшлі! Нашы!..», цалавалі і абдымалі салдат, а тыя гналі ворага далей. Мы з мамай праводзілі на фронт тату. Разам з ім прызывалі іншых вяскоўцаў. Жанчыны і дзеці плакалі, тыя, хто сыходзіў, спрабавалі суцяшаць. «Пагонім немцаў аж да самай Амерыкі!» — крычаў, помню, Клім Русіновіч. Не ведаў, бедны, што загіне, як, дарэчы, і дзясяткі нашых вяскоўцаў. Прычым не толькі на франтах.

У Пятровічы 19 снежня ўварваліся карнікі. Мой дзядуля Іван і жанчына з маленькім дзіцем схаваліся ў нашым двары, у зямлянцы.

Гітлераўцы прашылі яе з аўтаматаў, а потым кінулі гранату. Дзед Іван загінуў.

А ў гэты ж час у наваколлі ўжо гарэлі іншыя вёскі, немцы забівалі людзей: 42 чалавекі ў Раковічах, 16 — у Міхайлаўцы, 14 — у Язвіне, 7 — у нашых Пятровічах, 26 — у Селішчы.

Сведкі расказвалі, як людзі адтуль уцякалі ў лес і малых сястрычак адзін з немцаў прапусціў, а вось другі скарыстаўся замінкай: на лапціку ў малой развязалася абора, яна прыпынілася, каб зашморгнуць, і загінула — разам з сястрычкай. У вёсцы Раковічы карнікі згвалтавалі шаснаццацігадовую дзяўчыну, кінулі яе ў хлеў і падпалілі.

Назаўтра ў нашы Пятровічы ўварваліся нямецкія танкі. Іх было шмат. Яны крышылі платы, адзін — уткнуўся ў суседскую хату. Немцы акапаліся ў нашай вёсцы на шэсць месяцаў, сталі ў ёй гаспадарыць, гвалтавалі жанчын і дзяўчат, выганялі ў бежанцы. Я з мамай і яшчэ 20 чалавек з нашага роду апынуліся ў Азарыцкім канцлагеры. Там навечна засталіся мая цётка Прося, дзядзька Міхал і яго сынок. Не вярнуўся з фронту і дзядзька Дарафей... Мая вёска перажыла страх і голад, але адрадзілася.

А баі пад Парычамі ў снежні 1943 года ўвайшлі ў гісторыю. Камандуючы 65-й арміі П. І. Батаў пісаў пра іх так: «На вайне нярэдкія дні і нават месяцы схватак з ворагам, якія па сваім значэнні раўнацэнныя ўзяццю буйных гарадоў. Не грукочуць салюты ў гонар перамогі, але войскі праяўляюць не менш, а іншы раз і больш зацятасці, адвагі, мужнасці, самаахвярнасці і майстэрства. Да ліку такіх нельга не аднесці снежаньскую абарону пад Парычамі».

Аляксей Русіновіч,
в. Пятровічы,
Светлагорскі раён.

Смех смехам

«Зробяць вам зубы...»

У чарзе да стаматолага размовы, як і варта чакаць, пра балючае: адзін расказвае, як замест хворага зуба вырвалі здаровы, другі — як пакінулі корань, трэці — як яго не ўзяла «замарозка»...

Адна жанчына ўсё гэта слухала ды ціха... усміхалася.

— Сорамна з чужых бед смяяцца, — сказаў ёй нехта з «пацярпелых».

— А я і не смяюся, не! — як не пабажылася тая весялуха. — У мяне проста рот не закрываецца... Пратэзы не так паставілі... Яшчэ во раз прыехала. Можа, папраўляць?

...Неўзабаве — па чарзе — тая жанчына зайшла ў кабінет і досыць хутка вярнулася. Што важна — ужо без усмешкі. Сказала:

— Людцы, нічога не бойцеся! Абы чэрап і грошы... Зробяць вам зубы, якія захочаце!

Пасля гэтых слоў чарга павесялела і паспакайнела, смялей стала заходзіць да доктара, заносіць, прабачце, свае чарапы.

С. Атрохава, *в. Селішча, Слуцкі раён.*

Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Свае першыя апавяданні Уладзімір Навумовіч надрукаваў яшчэ ў 1963 годзе. І хоць з прозай не развітваўся ніколі, пазней значна больш часу стаў аддаваць літаратуразнаўству. Зрэшты, гэтага ад яго вымагае і шматгадовая праца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Сёння Уладзімір Аляксандравіч — дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры, з'яўляецца кандыдатам філалагічных навук. Ён аўтар дзясятка манаграфій і вучэбных дапаможнікаў.

Ну а ў якасці доказу таго, што проза для яго не стала чужой, прывяду хоць бы такія факты: летась у выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшаў эпісталярны раман Уладзіміра Навумовіча «Вабюліманс», прысвечаны Максіму Багдановічу, а сёлета аўтар рыхтуе да выдання свой наступны буйны твор.

Алесь БАДАК.

Уладзімір НАВУМОВІЧ

(З цыкла «Далонькі»)

Доўгія шкарпэткі і паліва для аўто

У падручніках па вывучэнні замежных моў даволі часта сустракаюцца літаратурныя байкі з малюнкамі. Сядзіць кошка каля мышынай нары і чакае, калі нарэшце з'явіцца доўгачаканая здабыча. Сіднем сядзіць каторую гадзіну, а мышкіна норка як была пустая, так і заставалася. Сядзіць-сядзіць кошка, а потым даўмелася: «Дай я пагаўкаю». Мышка, пачуўшы брэх сабакі, задумалася: «Ага! Калі там сабака, дык кошкі там не можа быць і напамінку». Выбралася наверх — тут яе кошка і заграбастала. Аблізваецца і кажа: «Добра ведаць хоць адну замежную мову!»

...Гэта здарылася ў гады Другой сусветнай вайны.

Люты і крыважэрны кіраўнік Трэцяга рэйха Адольф Гітлер, каб не дапусціць адкрыцця другога фронту на Захадзе апроч той бясслаўнай вайны, якую немцы вялі на Усходзе, дзе яго білі ўжо ў хвост і ў грыву, гналі назад у яго звярынае логава, загадаў сваім галаварэзам пад кіраўніцтвам вядомага тэрарыста, авантурыста і бандзюка, начальніка спецкаманды па выкраданні і знішчэнні відных военачальнікаў на чужой тэрыторыі Ота Скарцэні пранікнуць на тэрыторыю Злучаных Штатаў Амерыкі з мэтай ажыццявіць замах на кіраўніка дзяржавы. Восень 1944 года. Акцыя падпалкоўніка СС Ота Скарцэні па знішчэнні галоўнакамандуючага саюзнымі войскамі Эйзенхаўэра павінна была пасеяць сумненні ў неабходнасці вайны на два фронты, «закінуць» у галовы заакінскіх ваяк сумяццу і неразбярыху, парушыць планы «арміі наступу». Фашысцкія полчышчы ў самыя бліжэйшыя часы планавалі новыя наступальныя баі ў Ардэнах. Таму нечаканая і неверагодная вылазка за акіян павінна была дапамагчы ў падрыхтоўцы маштабных аперацый нямецкіх войск на новым напрамку ваенных дзеянняў.

Што далей? Загад фюрэра неабходна было выканаць у самыя кароткія тэрміны. Ота, бесшабашны і ваяўнічы Ота, вырашыў падысці да выканання аперацыі з усёй сур'ёзнасцю і максімальнай падрыхтоўкай. Стаўка Гітлера распрацавала і зацвердзіла падрабязны план дыверсіі пад кодавай назвай «Аперацыя «Грыф». Апантаны і вопытны дыверсант, якім быў Ота Скарцэні, сабраў каманду з трох тысяч афіцэраў і салдат, якія ведалі англійскую мову і лёгка маглі на ёй размаўляць. Была прадумана цэлая праграма дзеля таго, каб незаўважна пранікнуць на чужацкі бераг, увайсці ў давер да ворагаў і свабодна пачуваць сябе ў зусім варожым асяроддзі. Дыверсійныя банды праходзілі спецыяльную вывучку.

Апроч удасканальвання мовы, вывучэння асаблівасцяў англійскага і амерыканскага вымаўлення дыверсанты вучыліся цадзіць сліну скрозь зубы, плявацца і гучна размаўляць, нястрымна рагатаць без належнай прычыны, навучыліся жаваць гумку, лёгка засвоілі ўменне паляпваць па плячы субяседніка. Ота, кажуць, нават адкрыў фабрыку па выпуску доўгіх шкарпэтак, бо амерыканскія салдаты любілі закідваць ногі на стол, ці на табурэт у часы адпачынку. Нялёгка давалася шпіёнам Скарцэні весці вольную і прыветлівую гутарку, але пры гэтым не даставаць рукі з кішэняў, нават калі перад імі знаходзіліся вайскоўцы, якія былі старэйшыя па званні. Яны вучыліся курыць амерыканскія сігары, нязмушана закідваць галаву пры размове, седзячы на крэсле, усміхацца на ўсе трыццаць два зубы, ускокваць нечакана і гэтак жа нечакана садзіцца, штохвілінна хадзіць па пакоі, заглядваць у вочы таварышу, абменьвацца цыгарэтамі, сувенірамі. Пінжакі ў амерыканцаў, калі нават гэта былі мундзіры, заўсёды наросхліст, калі не было мундзіраў, дык рукавы сарочак закасаны, белыя накрухмаленыя каўнерыкі свабодна вытыркаліся і ўпіраліся ў падбародак. Нямецкія авантурысты нават спрабавалі навучыцца закідваць валасы на загрывак неяк нялоўка, своеасабліва, адным кідком галавы ўверх, вольнымі і рэзкімі рухамі, на манер амерыканскіх хлопцаў. Ужываліся ў чужое асяроддзе любымі сродкамі. Манеры засвойваліся цяжка, але настойліва. Але калі вы хочаце ведаць змест, вы будзеце слухаць словы, а калі вы хочаце зразумець сэнс — слухайце гукі.

Амерыканская разведка не спала ў шапку. Контрразведка ЗША распрацавала шэраг хітрых тэстаў, пытанняў, заданняў, адказы на якія маглі ведаць толькі «сапраўдныя амерыканцы». Напрыклад: «Хто такі «Голас?» Адказ: «Фрэнк Сінатра». Задавалі вымавіць словы «вянок», «гірлянда», якія правільна маглі гучаць у вуснах толькі тых, хто валодаў амерыканскім варыянтам англійскай мовы. Шмат немцаў і нават англічан трапіла пад падазрэнне і было арыштавана.

Аванцюра гітлераўцаў была выкрыта простым словам, якое няправільна ўжылі дыверсанты. Пераклад — гэта тое ж самае, што пераход за лінію фронту. Пра той эпізод паведамляла шведская прэса ў артыкуле «Аперацыя «Грыф». Там гаварылася: 13 снежня 1944 года каля адной з бензазаправачных калонак на краі Ардэнскага лесу спыніўся джып, у якім сядзела чацвёра салдат у амерыканскай форме.

— Бензін, калі ласка, — сказаў кіроўца маладому хлопцу ў амерыканскай форме, калі той падышоў да машыны. Амерыканец хацеў ужо заправіць джып, але насцярожыўся, падаў сігнал ваенным паліцэйскім. Адчуўшы небяспеку, джып сарваўся з месца і памчаўся поўным ходам. На абледзянелай дарозе ён сутыкнуўся на сустрэчнай паласе з аўтакалонай.

— Гэтыя тыпы — немцы! — выгукнуў амерыканскі салдат. — Я адразу зразумеў.

— Якім чынам? — спыталіся паліцэйскія.

— Шафёр папрасіў «бензін» і прамовіў «калі ласка».

— Што было не так?

— Нашы хлопцы кажуць проста «газ»...

Так адно няправільна ўжытае слова прывяло да поўнага краху складана выбудаванай і хітраспляценай варожай аперацыі на чужых землях.

Увага! Конкурс працягваецца!

Шаноўныя аўтары, нагадаем яго ўмовы:

✓ апавяданне на беларускай мове, якое нідзе дагэтуль не друкавалася;

✓ разглядаецца толькі адзін твор ад аднаго аўтара;

✓ памер тэксту да 5 старонак (ці да 10—12 тысяч знакаў).

Абавязкова паведамляйце сваё прозвішча і імя (сапраўдныя), імя па бацьку, дакладны паштовы адрас і поўныя пашпартныя звесткі (нумар і серыя, кім і калі выдадзены, асабісты нумар), а таксама кантактны тэлефон. Калі ласка, дадайце колькі слоў пра сябе: чым займаецеся, калі пачалі пісаць і якім тэмам аддаяце перавагу.

Апавяданні накіроўвайце на адрас: **газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, Мінск, 220013, з пазнакай «На літаратурны конкурс».** Можна дасылаць апавяданні на электронны адрас info@zviazda.by — таксама з пазнакай «Літаратурны конкурс». Звярніце ўвагу: рэдакцыя пакідае за сабой права не рэцэнзаваць і не вяртаць творы.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

Абарона саду ад хвароб і шкоднікаў ранняй вясной

З пачаткам вясны сад прачынаецца ад зімовай спячкі. І як толькі пачне прыпякаць сонца — актывізуюцца садовыя шкоднікі. Таму час прымаць меры па іх ліквідацыі і абароне раслін.

Апрацоўка саду ад шкоднікаў, якую праводзяць ранняй вясной, — гэта перш за ўсё апырсканне дрэў адмысловымі хімічнымі растворамі, якія нейтралізуюць шкодных насякомых. Тлі, лістаблошкі, пільшчыкі, даўганосікі, моль і мноства іншых нядобразычліўцаў толькі і чакаюць моманту, калі распадар зазяваецца.

Самае першае апырсканне дрэў праводзяць адразу пасля таго, як адступяць халады. Наступныя этапы апрацоўкі — да таго, як дрэвы зацвітуць і з'явяцца першыя завязі.

Самае першае, што трэба зрабіць перад апырсканнем, — навесці на ўчастку парадак: прыбраць смецце і старое лісце, ачысціць ствалы дрэў ад імхоў і лішайнікаў. Калі за акном усталюецца стабільна плюсавая тэмпература, можна пачынаць бяліць дрэвы.

Для гэтага рыхтуюць адмысловы раствор: у 10 л вады разводзяць 2 кг вапны (можна выкарыстоўваць вапнавую пасту), дадаюць 1 кг гліны і, каб трохі ўзмацніць ахоўны эфект, 300—350 г меднага купарвасу. Атрыманую масу акуратна вымешваюць. Такі раствор дапамагае выдаліць з кары дрэва лічынкі насякомых і іх яйкі, якія «зімавалі» ў расколінах.

Апрацоўка парэчак і агрэсту

Хоць парэчка і агрэст лічацца непераборлівымі, ім таксама патрэбна прафілактычная апрацоўка ад хвароб і шкоднікаў. Першую апрацоўку кустоў звычайна праводзяць адразу, як толькі сыдзе снег.

Для пачатку трэба ўважліва даследаваць кусты і глебу, каб разабрацца, з якімі менавіта шкоднікамі давядзецца змагацца. Пры аглядзе кустоў звяртаюць увагу на стан галінак. Калі яны выглядаюць як абпаленыя, то кусты пашкоджаны пупышкавай моллю. Калі пупышкі буйныя і нагадваюць качан капусты — гэта «работа» пупышачнага кляшча. Налёт на канцах галінак кажа пра мучністую расу, а адтуліны ўнутры галін — пра пашкоджанне куста шклянніцай. Хворыя галіны трэба абрэзаць. Гэта таксама датычыцца старых галін, тых, якія растуць унутр куста, галін з налётам і наогул усіх «падазроных».

Перш чым выкарыстаць «цяжкую артылерыю» з хімічных інсектыцыдаў, варта паспрабаваць старыя добрыя народныя сродкі: глебу вакол куста паліць гарачай вадой з невялікай колькасцю марганцоўкі або соды. Галіны кустоў таксама праліць гэтым гарачым растворам, выкарыстоўваючы палівачку.

Яшчэ адзін добры сродак — медны купарвас (50—100 г на 10 л вады). Канцэнтрацыя прэпарату залежыць ад узросту расліны і ступені яе пашкоджання (чым старэйшая расліна — тым вышэйшая канцэнтрацыя).

Выкарыстоўваюць і бардоскую вадкасць — 100 г меднага купарвасу, 100 г нягашанай вапны і 10 л вады. Гэтага хопіць для апрацоўкі 10 кустоў агрэсту і парэчкі. Важна, каб раствор быў выкарыстаны на працягу пяці гадзін пасля прыгатавання.

Апошнім часам усё большую папулярнасць для барацьбы з захворваннямі набіраюць біяпрэпараты (фітаспарын і іншыя). Усе яны добрыя, але іх эфектыўнасць ранняй вясной будзе вельмі нізкая, таму што гэтыя прэпараты працуюць пры тэмпературы ад 8 °С і вышэй.

Апрацоўка яблынь і груш

Перыяд ад сходу снегу да распускання пупышак лічыцца самым прыдатным для апрацоўкі яблынь і груш ад лішайнікаў і грыбковых інфекцый. Для апырсквання рыхтуюць 5-працэнтны раствор меднага купарвасу (500 г прэпарату растваряюць у 10 л вады). Для апырсквання ў гэты перыяд можна выкарыстоўваць і трохпрацэнтную бардоскую вадкасць. Ствалы дрэў і зямлю вакол іх можна апырскваць растворам мачавіны (700 г на 10 л вады). Такая апрацоўка дапаможа знішчыць шкоднікаў, якія там перазімавалі.

Да распускання пупышак для апрацоўкі яблынь і груш таксама ўжываюць і жалезны купарвас. Такая апрацоўка абароніць дрэвы ад лішайнікаў, шкоднікаў, якія ўладкаваліся на зіму ў кары, а таксама грыбковых захворванняў. Растворам гэтага прэпарату апырскваюць не толькі самі дрэвы, але і глебу пад імі. Для падрыхтоўкі сумесі 500 г жалезнага купарвасу разводзяць у 10 л вады.

Жалезны купарвас падыдзе і для апырсквання кустоў і костачкавых дрэў. Праўда, у гэтым выпадку ўжываюць трохпрацэнтную канцэнтрацыю.

Апрацоўка слівы і алычы

Першае апырсканне слівы і алычы вясной праводзяць яшчэ да таго, як пачнецца рух соку. Для таго каб абараніць дрэвы ад шкоднікаў, такіх як пладовы клешч, тля, калючая пладажэрка, даўганосік і іншыя, можна выкарыстоўваць, напрыклад, карбафос.

Каб абараніць дрэвы ад хвароб, рэкамендуецца апырскваць іх растворам мачавіны (700 г рэчыва на 10 л вады) або выкарыстоўваць трохпрацэнтны раствор меднага купарвасу ці бардоскую вадкасць. Глебу пад дрэвамі таксама апрацоўваюць.

Абавязкова пабяліць ствалы сліў, каб абараніць іх ад сонечных апёкаў, перападаў тэмператур, а таксама насякомых і іх лічынак, якія зімавалі ў кары.

Апрацоўка вішні і чарэшні

Апырскваць вішню і чарэшню таксама трэба да пачатку руху соку. Для гэтай мэты ўжываюць трохпрацэнтны раствор меднага купарвасу альбо бардоскай вадкасці, а таксама жалезны купарвас (300 г рэчыва на 10 л вады). Таксама для першага апырсквання выкарыстоўваюць мачавіну (700 г на вядро вады).

Калі ўсё зроблена правільна, то далейшага апырсквання ад хвароб можа і не спатрэбіцца. Калі пазбегнуць заражэння ўсё ж такі не атрымалася, для лячэння выкарыстоўваюць спецыяльныя прэпараты.

ДАЧНЫЯ ХІТРАСЦІ

❍ Расаду гарбузовых культур, такіх як агурок, патысоны, кабачок можна вырасціць такім чынам: нарэзаць дзёран на кубікі 10х12 см, перавярнуць каранямі ўверх, зрабіць паглыбленне і высадзіць у яго семечка.

❍ Калі расаду кожны дзень па 1-2 хвіліны пагладжваць па верхавіне, яна не будзе выцягвацца. Пры дотыку вылучаецца этылен, які стрымлівае гэты працэс.

❍ Суніцы карысна мульчыраваць іглічным ападам. Гэта палепшыць смак ягад, а таксама дапаможа справіцца з шэрай гніллю, даўганосікам, кляшчом, драцянікам. А мульчыраванне папараццю дапаможа суніцам справіцца з нематодай і шэрай гніллю.

❍ Для павышэння ўраджайнасці на ўчастак трэба прыцягваць насякомых-апыляльнікаў. Для гэтага высейваюць ружовую і белую канюшыну, аўсяніцу, мятлік. Прыцягваюць насякомых таксама кветкі гарчыцы белай і морквы.

❍ Добрым спадарожнікам для агурка з'яўляецца кроп.

❍ Пасеяныя ўздоўж бульбы і таматаў буракі дапамагаюць ім справіцца з фітафтарозам.

❍ Калі ўторкнуць сцябло крапівы побач з кожнай высаджанай расліной капусты, то капуста лепш прыжывецца.

❍ Ад капуснага матыля і тлі ў міжраддзі капусты высейваюць кроп, каляндру, сельдэрэй, аксаміткі, календулу.

❍ Пры пасадцы бульбы ў лунку высыпаюць жменю попелу — ён з'яўляецца ўгнаеннем і дапамагае ад драцяніка.

❍ Для павышэння ўраджайнасці і паляпшэння смаку ў першай палове чэрвеня часнок паліваюць спачатку салёнай вадой — 2 ст. лыжкі на 10 літраў вады, а затым звычайнай.

❍ Калі ў пачатку лета на лістах перцу завязалася некалькі пладоў, а цвіценне спынілася, то гэтыя плады трэба вырваць. Расліны пасля гэтага пачнуць цвісці з падвоенай энергіяй і да канца сезона дадуць высокі ўраджай.

Паэтычным радком

Шчырыя словы падтрымкі

Паэт Мікола Мятліцкі ведае Кітай не па чутках. Дзякуючы яго перакладам па-беларуску загучалі класікі літаратуры Паднябеснай, сам Мікола Міхайлавіч неаднойчы быў у гэтай краіне. І на бяду, якая здарылася там, не адгукнуцца не мог. А як паэту выказаць свае думкі і пачуцці? Канешне, вершам.

Мікола МЯТЛІЦКІ

Кітаю — з Беларусі

З табой, Кітай,
мы ў скрушную гадзіну,
Калі пагрозны цень
над светам вырас,
Калі кладзе няшчадна
ў дамавіну
Ахвяраў сотні
крыважэрны вірус.

З табой, Кітай, і сэрцам,
і душою,
І нас у свеце, салідарных,
многа.
Сяброўскаю
спагадлівай рукою
Пакуецца і наша дапамога.

Прымі, Кітай,
зямлі славянскай лекі,
Хай прынясуць табе
глыток спатолі,
Пацвердзяць тое:
мы — сябры навекі
І іншымі не станемся ніколі.

Я веру —
пераможна засвітае,
І знікнуць-сыдуць
змрочлівыя цені,
І аніштo Магутны Дух Кітая,
Нязломны,
не паставіць на калені!

15.02.2020.

Даты | Падзеі | Людзі

19 ЛЮТАГА

У краіне

1865 год — нарадзіўся Георгій Мікалаевіч Высоцкі, глебазнавец, лесавод і геабатанік, акадэмік. Адзін з заснавальнікаў лясной даследчай справы ў Беларусі.

1890 год — нарадзіўся Казімір Сваяк (сапр. Канстанцін Мацвеевіч Станповіч), беларускі пісьменнік, грамадскі дзеяч. Скончыў Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю. У 1915 годзе пасвячоны ў ксяндзы. Абавязкі ксяндза сумяшчаў з адукацыйна-асветніцкай работай: адкрываў беларускія школы, збіраў беларускі фальклор, у касцёле гаварыў на беларускай мове. Праследаваўся царкоўнымі і свецкімі ўладамі Польшчы за прапаганду беларускай мовы і культуры. Пісаў вершы, апавяданні, эсэ, філасофскія эцюды, гумарэскі, публіцыстычныя артыкулы рэлігійнага і літаратурна-крытычнага зместу. Аўтар публіцыстычнага трактата аб шкодзе п'янства «Алкаголь», паэтычнага зборніка «Мая ліра», п'есы «Янка Канцавы», паэмы «Купалле» і іншых твораў.

1935 год — нарадзіўся Генадзь Сцяпанавіч Аўсяннікаў, акцёр, народны артыст Беларусі (1974), народны артыст СССР (1991). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1988).

1970 год — нарадзіўся Вадзім Леанідавіч Сашурын, беларускі спартсмен (біятлон), заслужаны майстар спорту Беларусі (1996). Чэмпіён свету (1996, 1997, 1999), сярэбраны (2001) і бронзавы (1995, 1996, 1999) прызёр чэмпіянатаў свету. Чэмпіён Еўропы (1995), сярэбраны (1996) і бронзавы (1998) прызёр чэмпіянатаў Еўропы. Шматразовы пераможца і прызёр этапаў Кубка свету.

У свеце

1855 год — уступіў на трон расійскі імператар Аляксандр II, старэйшы сын імператара Мікалая I і імператрыцы Аляксандры Фёдараўны. Яго праўленне, якое доўжылася больш за 25 гадоў, адзначылася адменай прыгоннага права (1861), а таксама правядзеннем земскай, судовай і ваеннай рэформаў, пачаткам актыўнага будаўніцтва чыгунак.

1945 год — нарадзіўся Юрый Міхайлавіч Антонаў, спявак, кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі, народны артыст Расіі. Скончыў Маладзечанскае музычнае вучылішча. Працаваў у калектывах эстраднага жанру, у тым ліку ў ансамблі пад кіраўніцтвам Віктара Вуячыча, аркестры «Современник», вакальна-інструментальных ансамблях «Поющие гитары», «Магистраль» і іншых. Аўтар і выканаўца папулярных песень.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	8.22	18.25	10.03
Віцебск	8.14	18.12	9.58
Магілёў	8.12	18.15	10.03
Гомель	8.05	18.15	10.10
Гродна	8.36	18.41	10.05
Брэст	8.34	18.45	10.11

Месяц

Апошняя квадра 16 лютага.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Марфы, Марыі, Хрысціны, Анатоля, Васіля, Дзмітрыя, Івана, Максіма, Юльяна.*
К. *Міраславы, Арнольда, Міраслава, Пятра.*

Фота Анатоля КІЦІНЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Каб утрымаць мужа, прымусьце яго крыху раўнаваць.

Каб страціць мужа, прымусьце яго раўнаваць трошкі больш.

Маладой жонцы на заметку.

Калі муж есць прыгатаваную вамі кашу і нахвальвае... не варта прызнавацца, што гэта суп!

Кот з'еў чатыры кілаграмы шашлыку, узважылі ката — роўна чатыры кілаграмы. Загадка — куды дзеўся кот?



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 382.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 18 лютага 2020 года.